

ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ – ВЯЛІКАЯ РЫЗЫКА? 7

АРЫЕНЦІРЫ Ў КЛІМАТЫЧНАЙ ТЭМЕ 8





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛЮТАГА 2024 г. АЎТОРАК № 41 (30175)


## КОРАТКА

• **Больш за 39 тысяч жыхароў ЕС уехалі ў Беларусь па бязвізе з пачатку 2024 года.**

• Сярэдні заробак у Беларусі ў студзені склаў Br1991,2.

• **Беларускія прадпрыемствы паспяхова прадэманстравалі сваю прадукцыю на выставе Gulfood у ААЭ.**

• «Бабруйскаграмаш» паставіць партыю кормаларыхтоўчай тэхнікі ва Узбекістан.

• **Загрузка мінскіх гасцініц у 2023 годзе павялічылася больш як на 10 працэнтаў.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Беларусь заўсёды была і застаецца перакананым прыхільнікам еўразійскай інтэграцыі. Мы максімальна настроены на тое, каб паскорыць працэсы, якія ідуць на еўразійскай прасторы. Краіны — удзельніцы саюза павінны выступаць адзіным фронтам адносна тых выклікаў і пагроз, з якімі сутыкаюцца. У нас саюз эканамічны, але эканоміка цяпер якраз-такі знаходзіцца на перадавых пазіцыях з пункту гледжання ўдараў, пагроз, якім падвяргаюцца нашы краіны. У першую чаргу гэта Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь. Таму пытанні далейшага ўмацавання нашых эканамічных сувязяў з'яўляюцца як ніколі актуальнымі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ЛЮДЗІ ЗРАЗУМЕЛІ ЦЯПЕРАШНІ МОМАНТ»

**Сёлетнюю электаральную кампанію і яе вынікі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з Сяргеем Лебедзевым, генеральным сакратаром СНД, старшынёй місіі назіральнікаў ад СНД.**

Прэзідэнт заўважыў, што члены місіі СНД былі не толькі назіральнікамі, але і фактычна арганізатарамі выбараў. «Вялікі дзякуй вам за тую падтрымку і дапамогу, якую вы аказалі. Яшчэ раз падкрэсліваю: падтрымку і дапамогу ў арганізацыі. Не проста прыехалі і глядзелі па баках, хто бюлетэні запаўняе ці не запаўняе. Гэта сапраўды была сяброўская работа вашай місіі, і вашу работу мы вельмі шануем. У сродках масавай інфармацыі людзі гэта бачылі, усе вашы заявы. Гэта мабілізавала людзей», — сказаў ён.

СТАР. 2



Фота БелТА.

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

# Выбар зроблены



Фота БелТА.

## Палата прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы ўсіх узроўняў сфарміраваныя

**Старшыня Цэнтрвыбаркама Ігар КАРПЕНКА агучыў папярэднія вынікі выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання.**

**У спісы для галасавання быў уключаны 6 912 221 выбаршчык. Такім чынам, у гэтай найважнейшай палітычнай падзеі прынялі ўдзел 73,09 % грамадзян, уключаных у спісы. У разрэзе абласцей: Брэсцкая вобласць — 75,82 %, Віцебская вобласць — 75,63 %, Гомельская вобласць — 75,85 %, Гродзенская вобласць — 76,90 %, Мінская вобласць — 74,20 %, Магілёўская вобласць — 77,03 %, горад Мінск — 61,54 %. Высокую яўку грамадзян на дэпутацкіх выбарах адзначыў і кіраўнік дзяржавы.**

СТАР. 3

Традыцыі і сучаснасць

# НАТУРПРАДУКТ У СПАДЧЫНУ

## Як Якуб Колас атрымліваў па два ўраджаі з адной градкі, і што з «даўно забытага старога» актуальна на хвалі цікавасці да эказемляробства

**І ў дачнікаў, і ў фермераў зараз модна весці гаспадарку, не ўжываючы «хімію». Больш за тое, асновы экалагічнага земляробства сёння імкнуцца прымяняць і буйныя гаспадаркі краіны.**

Перажыўшы пандэмію (і нават яшчэ да яе), спажывец стаў больш усвядомленым. Людзі хочуць ужываць прадукты, не «запраўленыя» гербіцыдамі, пестыцыдамі і геннай мадыфікацыяй, без кансервантаў, фарбавальнікаў і ўзмацняльнікаў смаку. То-бок альбо шукаюць на ўпакоўцы маркіроўку «эка», «біё» ці «фермерскі прадукт», альбо «вяртаюцца да вытокаў» і вырошчваюць вітаміны самастойна. На карысць апошняга варыянта робяць выбар многія — тут табе і хобі, і ўпэўненасць у прадукце, а часцяком яшчэ і эканомія. Але як атрымліваць высокія ўраджаі, калі ад «хіміі» вы вырашылі адмовіцца?

### ЭКАТЭХНАЛОГІІ АД ПРАДЗЕДАЎ

Дваццатае і пачатак дваццаць першага стагоддзя прынеслі з сабой тэхналагічныя і навуковыя прарывы ў многіх сферах. Мне запомніўся аповед майго дзеда, ён быў ваенным медыкам, пра тое, як у Савецкім Саюзе ўпершыню сталі шырока ўжываць антыбіётыкі (было гэта ў 1942 годзе): «пачалі выжываць нават тыя, хто, здавалася, адной нагой ужо ў магіле, і, — казаў ён, — здавалася, навука здолела перамагчы смерць».

СТАР. 9



ISSN 1990 — 763X

# «Беларусь і Расія зацікаўлены, каб ЕАЭС пераймала вопыт Саюзнай дзяржавы»

**Падчас размовы з журналістамі ў адзіны дзень галасавання Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза. Больш падрабязна перспектывы арганізацыі кіраўнік дзяржавы абмеркаваў з Бакытжанам Сагінтаевым, старшынёй Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі, падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці.**



Фота БелТА.

Калегію Еўразійскай эканамічнай камісіі Бакытжан Сагінтаеў узначаліў 1 лютага. А да гэтага займаў шэраг важных дзяржаўных пастоў у родным Казахстане. «Вы чалавек вопытны, які прайшоў немалы шлях. Наша арганізацыя — гэта арганізацыя эканамічнага характару. Прынцыповы падыход Казахстана да гэтых пытанняў я вельмі добра ведаю, паколькі з Нурсултанам Абішавічам (першым Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым) быў каля вытокаў стварэння гэтай арганізацыі. Цяперашняе кіраўніцтва Казахстана прыхільнае да гэтага курсу — менавіта эканамічнай накіраванасці Еўразійскага эканамічнага саюза. Думаю, што, выкарыстоўваючы ваш вопыт і вашу ранейшую ўцягнутасць у эканамічныя працэсы, нам удасца нямала зрабіць. Галоўнае — вы ініцыятыву праяўляйце, не маўчыце. Думаю, вы будзеце такім рашучым чалавекам і будзеце заўважаць тое, што, вы бачыце, з'яўляецца перашкодай у развіцці нашага Еўразійскага эканамічнага саюза», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Расія зацікаўлены, каб ЕАЭС пераймала вопыт Саюзнай дзяржавы, структуры з глыбокім узроўнем інтэграцыі. Ён заўважыў, што ЕАЭС, СНД і Саюзная дзяржава — гэта розныя фарматы шматузроўневай інтэграцыі. Па яго словах, з пункту гледжання інтэграцыі, на самым нізкім узроўні знаходзіцца СНД. «Мы зацікаўлены, напэўна, і вы, каб СНД арыентавалася на ЕАЭС. А можа, і на работу ў рамках нашых саюзніцкіх адносін з Расіяй, — заявіў Прэзідэнт. — Але гэта воля кіраўнікоў дзяржаў, урадаў, эліты гэтых дзяржаў. Мы асабліва не настойваем на гэтым працэсе. Але як варыянт чаму б не?»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння існуе шэраг праблем эканамічнага характару, над вырашэннем якіх трэба сур'ёзна працаваць. «Нам бы хацелася, і гэта трэба зрабіць у перыяд вашага старшынства, паколькі сам Казахстан адыгрывае вельмі важную ролю ў саюзе, каб мы прыбралі ўсялякія бар'еры, якія яшчэ, на жаль, існуюць у нас. Нам трэба дамовіцца наконт энергетычных пытанняў, каб былі роўныя магчымасці ў дзяржаў. Трэба адзіныя рынкі газу, нафты. Агульны рынак трэба ствараць. Ад гэтага мы нікуды не ўцячом. Вы бачыце, як сітуацыя складваецца вакол, і самі абставіны падштурхоўваюць нас да больш цеснага супрацоўніцтва ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза», — сказаў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што ЕАЭС — арганізацыя найперш эканамічная. І гэта аснова ўзаемаадносін паміж дзяржавамі. «Будзе эканоміка — будзе і палітыка, і дыпламатыя, і ваенныя адносіны мы будзем развіваць. Таму трэба ствараць смялей на прынцыпах кааперацыі сумесныя прадпрыемствы, фінансаваць іх. На нас вы заўсёды можаце разлічваць. Таксама шчыра кажаце тое, што мы павінны зрабіць. Калі мы чагосьці зусім не можам зрабіць, мы вам шчыра пра гэта скажам. Але пакуль такіх пытанняў няма, якія мы маглі б абысці і не ўдзяляць у развіцці нашага саюза», — падкрэсліў ён.

Прыезд Бакытжана Сагінтаева ў Беларусь супаў з кульмінацыяй электаральнага працэсу. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што выбары дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы прайшлі спакойна. «Вы ведаеце, што мы пачалі акуратнае абнаўленне палітычнай сістэмы. Мы бачым, што гэта трэба зрабіць. Змяняецца пакаленне палітыкаў. Новыя людзі прыходзяць, моладзь. Таму нам трэба рыхтавацца загадзя эвалюцыйным чынам. У нас пачаўся гэты няпросты працэс», — распавёў ён. Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што сёлетнія выбары асабліва важныя, бо ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй новы склад Палаты прадстаўнікоў і прадстаўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў стануць асновай новага канстытуцыйнага органа — Усебеларускага народнага сходу.

У сваю чаргу Бакытжан Сагінтаеў адзначыў выдатную арганізацыю выбарчай кампаніі. Ён прызнаўся, што быў па-добраму здзіўлены вялікай колькасцю людзей, якія прагаласавалі датэрмінова. Бакытжан Сагінтаеў павіншаваў беларускага лідара з паспяховым правядзеннем электаральнай кампаніі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Самае галоўнае — людзі зразумелі цяперашні момант»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы адзначыў высокую яўку выбаршчыкаў. Ён прызнаўся, што такіх вялікіх лічбаў не чакаў. «У нас ніколі не было ў мясцовыя саветы, у парламенцкія выбары такой яўкі. Нюансаў хапае. У тым ліку і зберглыя нам тут са сваімі нязграбнымі рухамі цела дапамаглі. Самае галоўнае — людзі зразумелі цяперашні момант, правільна ўспрымаюць, характарызуюць яго, — адзначыў ён. — І, зыходзячы з ужо майго досведу, спрабуем прааналізаваць ход гэтай кампаніі і бачым, што цяперашнюю ўладу падтрымліваюць больш за 87 працэнтаў насельніцтва. Адназначна падтрымліваюць. Ёсць невялікая колькасць, якія вагаюцца. Натуральна, ёсць і незадаволеныя людзі, мы гэта цудоўна разумеем. Таму ў гэтым электаральным цыкле нам трэба гэта аналізаваць і рабіць адпаведныя высновы, трэба сёе-тое выпраўляць. Такіх праблем у нас няшмат. Мы за год іх падцягнем, выправім, і я ўпэўнены, што людзі яшчэ больш прыйдуць на прэзідэнцкія выбары». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што правядзенне прэзідэнцкіх выбараў у наступным годзе будзе няпростым працэсам: «Вы як спецыяліст у гэтай справе разумееце, што разгойдваць, хістаць нас будуць вельмі сур'ёзна. Мы гатовы да гэтага вельмі сур'ёзна, рыхтаваліся да гэтага».

Прэзідэнт заўважыў, што ў сёлетняй электаральнай кампаніі хапала навацый. Упершыню ў гісторыі прайшоў адзіны дзень галасавання, калі выбралі ўсю вертыкаль прадстаўнічых органаў улады ад сельскіх Саветаў, раённыя, абласныя, гарадскія і да парламента. «Мне папярэдне далажылі аб выніках. Прайшло вельмі добра, мы выбралі ўсіх», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён яшчэ раз падзякаваў Сяргею Лебедзеву і назіральнікам СНД за працу. Прэзідэнт таксама пацікавіўся, што Сяргей Лебедзеў як дасведчаны чалавек можа параіць на будучыню.

235 назіральнікаў з краін СНД пабывалі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Уважліва назіралі і за датэрміновым галасаваннем і за ходам выбараў у адзіны дзень галасавання, размаўлялі з выбаршчыкамі і з мясцовымі назіральнікамі з тым, каб атрымаць шырокую карціну таго, як праходзяць выбары. Старшыня місіі назіральнікаў СНД падкрэсліў, што самае галоўнае ў сёлетняй кампаніі — добры настрой выбаршчыкаў. «Асноўная думка, якую нам выказвалі тыя, з кім мы гутарылі, — «галоўнае для нас — мір, стабільнасць і дабрабыт Беларусі». З гэтым настроем людзі ішлі на выбары. Мы гэта адчувалі, мы гэта чулі. Я думаю, гэтае жаданне забяспечыць мір і стабільнасць Беларусі якраз заахвоціла людзей прыйсці прагаласаваць, і адсюль такая высокая яўка», — адказаў ён.

## У тэму

### Выбаршчыкі неабыякавыя да таго, куды ідзе Беларусь

У размове з журналістамі Сяргей Лебедзеў адзначыў святочную атмасферу, у якой праходзілі гэтыя выбары: «У адрозненне ад 2020 года, калі мы сутыкнуліся з правакацыямі апазіцыйных сіл, якія спрабавалі сарваць выбары, дэстабілізаваць сітуацыю, атмасфера на ўчастках была святочная. Многія прыходзілі з сем'ямі, з дзецьмі. Нават пажылыя людзі, якія б маглі прагаласаваць дома, лічылі сваім абавязкам асабіста прыйсці на ўчастак. Такая зацікаўленасць людзей ва ўдзеле ў галасаванні сведчыць аб тым, што людзям не ўсё роўна. Выбаршчыкі неабыякавыя да таго, куды ідзе Беларусь, якая будучыня яе чакае».

Старшыня місіі падкрэсліў, што назіральнікаў з краін СНД таксама хвалюе лёс Беларусі, таму што Беларусь з'яўляецца актыўным удзельнікам Садружнасці. Прадстаўнікі Беларусі актыўна працуюць у органах СНД. У місіі назіральнікаў СНД не было задачы шукаць нейкія недахопы і потым крытыкаваць кіраўніцтва Беларусі. Сяргей Лебедзеў заўважыў, што гэта ўжо зрабілі на Захадзе. Ён нагадаў, што прэс-сакратар Дзяржздэпартамента ЗША заявіў, што выбары ў Беларусі прайшлі ў абстаноўцы страху. «Але я ніякага страху ў выбаршчыкаў не бачыў. Уражвае, што тут яшчэ выбары не скончыліся, а іх ужо называюць недэмакратычнымі. Калі ён казаў гэтыя словы, з-за розніцы ў часе ў восем гадзін у Вашынгтоне была ноч і вынікі выбараў там не маглі ведаць. Аб прадузятым падыходзе заходніх назіральнікаў, мне здаецца, і казаць не даводзіцца. Гэта відавочна. І цалкам лагічным і абгрунтаваным з'яўляецца рашэнне кіраўніцтва Беларусі, ЦВК і МЗС не запрашаць заходніх назіральнікаў, таму што аб'ектыўнай ацэнкі ад іх чакаць не даводзіцца», — адзначыў Сяргей Лебедзеў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Германіі ўдвая ўзрасла колькасць нападзенняў на бежанцаў




Колькасць нападаў на бежанцаў і інтэрнаты для часовага пражывання мігрантаў у Германіі ў мінулым годзе ўзрасла амаль у два разы ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Аб гэтым паведаміла турэцкае дзяржаўнае інфармагенцтва Anadolu, са спасылкай на газету Neuen Osnabrucker. Так, паводле даных, нападу ў Германіі ў 2022 годзе падвергліся 1248 бежанцаў, тады як летась гэтая лічба павялічылася да 2378 чалавек. У выніку інцыдэнтаў істотна пацярпелі 219 чалавек. Цягам 2022-га ў Германіі адбылося 70 нападаў на інтэрнаты для бежанцаў, а за аналагічны перыяд мінулага года гэтая лічба павялічылася да 180.

### У Францыі зрэжуць дзяржрасходы на 10 мільярдаў еўра



Міністр эканомікі і фінансаў Францыі Бруна Ле Мэр паведаміў аб рэзкім пераглядзе ў бок паніжэння прагнозу эканамічнага росту краіны і ў сувязі з гэтым абвясціў аб новым плане эканоміі ў памеры 10 мільярдаў еўра на дзяржаўных выдатках, перадае тэлеканал BFM TV. Паводле яго слоў, новы план эканоміі прадугледжвае скарачэнне бюджэтаў усіх міністэрстваў краіны. У ведамстве разлічваюць, што рост французскага ВУП сёлета складзе 1 працэнт (раней прагназавалася 1,4 працэнта). Адзначаецца, што гэта адбываецца ў кантэксце эканамічнага спаду ў Еўропе і, у першую чаргу, у Германіі. У той жа час Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця чакае, што ВУП Францыі павялічыцца ўсяго на 0,6 працэнта, што на 0,2 працэнтнага пункта ніжэй за яе прагнозы ў лістападзе. Раней Еўрапейская камісія таксама панізіла прагноз росту ВУП еўразоны да 0,8 працэнта ў параўнанні з чаканымі да гэтага часу 1,2 працэнта.

### Нашэсце саранчы пагражае харчовай бяспецы шэрагу краін



Нашэсце саранчы, справакаванае глабальнай зменай клімату, пагражае харчовай бяспецы Афрыкі, Блізкага Усходу і Паўднёвай Азіі. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на часопіс Science Advances. Паводле даных крыніцы, з-за пацяплення клімату арэал пасялення насякомых можа павялічыцца на чвэрць, што істотна паўплывае на ўраджай і, як следства, будзе ўяўляць пагрозу для глабальнай харчовай бяспекі. Сінгапурскія і кітайскія навукоўцы правялі даследаванне, паводле якога адзін рой саранчы, які займае плошчу ў 1 км$^2$, налічвае каля 80 мільёнаў насякомых. За адзін дзень яны могуць знішчыць аб'ём культур, які неабходны для харчавання 35 тысяч чалавек. Даследчыкі таксама прывялі інфармацыю аб 10 краінах, якія не суседнічаюць адна з адной і знаходзяцца пад пагрозай нашэсця саранчы. Сярод іх — Марока, Індыя, Алжыр, Пакістан і Саудаўская Аравія. Паводкі і хуткасць ветру — адны з асноўных фактараў распаўсюджвання насякомых, істотны ўплыў на сітуацыю таксама аказвае кліматычны феномен Эль-Ніньё.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Выбар зроблены

Падчас прэс-канферэнцыі ў Інфармацыйным цэнтры Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка звярнуў увагу на тое, што ўпершыню ў Беларусі праведзены выбары дэпутацкага корпуса ў такім фармаце на падставе абноўленай Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь. «Выбарчая кампанія прайшла ў тэрміны, устаноўленыя заканадаўствам і каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні адзінага дня галасавання, зацверджаным Цэнтральнай выбарчай камісіяй», — падкрэсліў ён.

### У кол-цэнтр пры ЦВК паступіла 1,5 тысячы вусных зваротаў грамадзян

З пачатку выбарчай кампаніі ў Цэнтральнай камісіі для аператыўнага рэагавання на запыты выбаршчыкаў была арганізавана работа кол-цэнтра, якім прынята больш за 1,5 тысячы вусных зваротаў грамадзян. Таксама вялася работа па разглядзе пісьмовых зваротаў. «На ўсе звароты па пытаннях кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі былі дадзены адказы, — адзначыў Ігар Карпенка. — Супрацоўнікамі кол-цэнтра прымаліся меры па аператыўным вырашэнні запытаў, якія паступалі».

Людзі цікавіліся, як знайсці ўчастак для галасавання (дарэчы, дапаможны сэрвіс па пошуку ўчастка для галасавання размяшчаўся на сайце ЦВК), удакладнялі звесткі аб перадвыбарных праграмах кандыдатаў, выказвалі жаданне галасаваць не па месцы рэгістрацыі, прасілі арганізаваць галасаванне дома.

Усе звесткі аб кожным этапе адзінага дня галасавання размяшчаліся на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі, у сацыяльных сетках, сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, публікаваліся ў друкаваных сродках масавай інфармацыі.

Па меркаванні старшыні Цэнтрвыбаркама, з улікам зваротаў, якія паступалі, і зыходзячы са шматузроўневасці выбараў у адзіны дзень галасавання, да наступнай такой выбарчай кампаніі будзе мэтазгодна разгледзець пытанне аб стварэнні адзіных інфармацыйных крыніц, якія змяшчаюць звесткі аб кандыдатах усіх узроўняў, іх асабістых і дзелавых якасцях, а таксама прапанаваных кандыдатамі ў дэпутаты праграмах для зручнасці выбаршчыкаў у пошуку і азнаямленні з неабходнай інфармацыяй. ЦВК прапрацуе дадзенае пытанне.

«Цэнтральная камісія ў цэлым вывучыць правапрымяняльную практыку і з улікам меркавання рэгіёнаў, выбарчых камісій, будзе праведзены аналіз рэалізацыі выбарчага заканадаўства пры правядзенні адзінага дня галасавання», — адзначыў Ігар Карпенка.

### Усе 1284 мясцовыя Саветы дэпутатаў сфарміраваны

Кажучы аб яўцы выбаршчыкаў у адзіны дзень галасавання, старшыня Цэнтрвыбаркама адзначыў, што з агульнай колькасці выбаршчыкаў, якія галасавалі ўпершыню, прыйшлі на выбары амаль 77 %. Ва ўчастковую выбарчую камісію ўчастка для галасавання № 248, размешчанага ў Мінску, што быў вызначаны для галасавання грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой і стаяць на консульскім уліку, звярнулася шэсць чалавек, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам прынялі ўдзел у галасаванні па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Нагадаем, галасаванне праходзіла на 5411 участках для галасавання. З іх 215 участкаў было створана ў бальніцах, санаторыях, дамах адпачынку і іншых месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў, 11 — у воінскіх часцях.

«Па папярэдніх выніках выбараў, усе 1284 мясцовыя Саветы дэпутатаў сфарміраваны ў правамоцным складзе, — канстатаваў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. — З іх — 6 абласных і Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў, 118 раённых, 10 гарадскіх у гарадах абласнога падпарадкавання, 14 гарадскіх у гарадах раённага падпарадкавання, 8 пасялковых і 1127 сельскіх Саветаў».

Ігар Карпенка паведаміў, што на падставе патрабаванняў Выбарчага кодэкса вынікі выбараў у адпаведныя Саветы дэпутатаў будуць устаноўлены выбарчымі камісіямі і даведзены да ведама выбаршчыкаў у друкаваных сродках масавай інфармацыі, а таксама на сайтах адпаведных выканкамаў. Цэнтральная выбарчая камісія правядзе 1 сакавіка сваё пасяджэнне па ўстанаўленні вынікаў выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і ажыццявіць іх рэгістрацыю на падставе рашэнняў абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій, пратаколаў акруговых камісій, пярвічных дакументаў. Адпаведныя звесткі таксама будуць абнародаваны.

### Сярод дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — 37 жанчын і 70 партыйцаў

У адзіны дзень галасавання выбрана 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, іх персанальныя даныя былі агучаны напярэдадні (прозвішчы гэтых людзей будуць апублікаваны ў заўтрашнім нумары «Звязды»).

Ігар Карпенка расказаў аб новым складзе Палаты прадстаўнікоў. «Сярод выбраных дэпутатаў з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання — 20 чалавек (18,2 % ад агульнага складу), — канкрэтызаваў ён. — Жанчыны — 37 чалавек (33,6 %), моладзь ва ўзросце да 31 года — 1 чалавек, члены палітычных партый — 70 чалавек, беспартыйныя — 40. Сярод членаў палітычных партый прадстаўлены: партыя «Белая Русь» — 51 чалавек (46,4 %), Камуністычная партыя Беларусі — 7 чалавек (6,4 %), Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі — 4 чалавекі (3,6 %), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці — 8 чалавек (7,3 %)».

### «Выбарчы працэс ішоў строга ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам»

Ігар Карпенка адказаў на пытанні журналістаў. Адно з іх датычылася паведамленняў ад Дзяржаўнага дэпартамента ЗША і МЗС Германіі, якія змясцілі інфармацыю аб тым, што выбары ў нашай краіне «праводзіліся недэмакратычна і прайшлі ў атмасферы страху».

«Напэўна, нашаму ЦВК трэба больш аператыўна працаваць і таксама рэагаваць на іх выбары, — адзначыў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі. — Не чакаючы вынікаў, ацэнак міжнародных экспертаў, нацыянальных назіральнікаў, будзем таксама даваць ацэнку іх выбарам. Няхай гэта будзе на іх сумленні».

Ігар Карпенка заўважыў, што падобныя заявы вельмі пахнуць старымі шарпаўскімі метадычкамі. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што пры правядзенні адзінага дня галасавання Цэнтрвыбаркам кіраваўся выключна беларускім заканадаўствам і праводзіў усе выбарчыя працэдуры ў адпаведнасці з ім. Ігар Карпенка дадаў, што яшчэ будуць агучаны вынікі нацыянальных і міжнародных назіральнікаў, але і іх папярэднія заявы, і інфармацыя, якую транслявалі СМІ, ужо сведчаць аб тым, што выбарчы працэс ішоў строга ў адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам нашай краіны.

Пракаментаваў старшыня ЦВК і яўку мінчан (сталіца паказала найменшую актыўнасць выбаршчыкаў). «Мы аналізуем усе кампаніі, і магу сказаць, што Мінск традыцыйна галасуе крыху менш актыўна, чым рэгіёны, — звярнуў увагу ён і расказаў, што ёсць выпадкі, калі сужэнцы прапісаны па розных адрасах і проста ляну юцца паехаць у іншы мікраён горада, каб прагаласаваць. — Напэўна, трэба больш увагі ўдзяляць тлумачальнай рабоце. Асабліва па гэтай навацыі. Хоць варта і іншыя пытанні прааналізаваць для таго, каб найлепш данесці інфармацыю да грамадзян і пабуджаць іх да праяўлення актыўнасці». У першую чаргу Ігар Карпенка парэкамендаваў грамадзянам самім клапаціцца аб тым, дзе прагаласаваць, а не толькі спадзявацца на запрашэнне, у якім будзе ўказана патрэбная інфармацыя.

### Першае пасяджэнне УНС будзе праведзена не пазней за 25 красавіка

Кажучы аб фарміраванні Усебеларускага народнага сходу, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі звярнуў увагу, што, у адпаведнасці з Канстытуцыяй, адведзена 60 дзён на фарміраванне і скліканне першага пасяджэння УНС. Ігар Карпенка адзначыў, што ў Цэнтрвыбаркаме 1 сакавіка пры падвядзенні вынікаў адзінага дня галасавання плануецца ў тым ліку разгледзець пытанне аб прызначэнні выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу ад структур грамадзянскай супольнасці і ад нававыбранага дэпутацкага корпуса мясцовых Саветаў. «Нам трэба будзе падзяліць квоты для дэпутацкага корпуса мясцовых Саветаў, і нам неабходна будзе размеркаваць колькасць месцаў паміж суб'ектамі грамадзянскай супольнасці, якія пацвердзілі свой удзел у выбарах дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу», — удакладніў ён.

Таксама старшыня ЦВК паведаміў аб неабходнасці фарміравання новага складу Савета Рэспублікі. «Неабходна таксама адкрыць устаноўчыя сесіі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі для таго, каб дэпутаты ўступілі ў свае законныя правы, бо дэпутаты абедзвюх палат парламента па пасадзе з'яўляюцца дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, — патлумачыў Ігар Карпенка. — І не пазней за 25 красавіка нам трэба будзе правесці першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу».

# ПРАЗРЫСТА, ПРАЎДЗІВА І ДЭМАКРАТЫЧНА

## Міжнародныя назіральнікі місій ад СНД і ШАС агучылі сваю ацэнку дэпутацкіх выбараў у Беларусі

**Адзначана, што адзіны дзень галасавання прайшоў на высокім арганізацыйным узроўні і ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Афіцыйныя заявы місій назіральнікаў ад СНД і ШАС будуць апублікаваны пасля афіцыйнага зацвярджэння вынікаў выбараў. Пакуль — папярэдняя ацэнка выбарчага працэсу.**

### «Актыўнасць выбаршчыкаў — пацвярджэнне вялікай цікавасці грамадзян Беларусі да выбараў»

У складзе місіі ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў назіранне за выбарамі дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў адзіным дні галасавання ажыццяўляла 235 экспертаў з усіх краін СНД, за выключэннем Украіны і Малдовы. Работу ў Беларусі місія пачала 22 студзеня. На першым этапе ажыццяўлялі назіранне 59 чалавек — так званыя доўгатэрміновыя назіральнікі. Яны выязджалі ў рэгіёны, сустракаліся з прадстаўнікамі партый, працоўных калектываў, якія вылучылі сваіх кандыдатаў у Палату прадстаўнікоў. З пачаткам датэрміновага галасавання ў нашу краіну прыбылі кароткатэрміновыя назіральнікі. І тыя, і іншыя назіралі за выбарамі як у Мінску, так і ва ўсіх абласцях.

Падчас прэс-канферэнцыі ў Інфармацыйным цэнтры **генеральны сакратар СНД, кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ** звярнуў увагу на тое, што ўдзельнікі місіі ўважліва прааналізавалі Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь. «Гэтыя змяненні садзейнічаюць зацвярджэнню дэмакратычных прынцыпаў у працэсе назірання і поўнасцю адпавядаюць агульнапрызнаным дэмакратычным нормам правядзення выбараў, — падкрэсліў ён. — Самае галоўнае, што Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь цалкам забяспечвае права грамадзян Беларусі на свабоднае волевыяўленне».

Кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД адзначыў, што ў працэсе назірання эксперты Садружнасці кіраваліся выключна заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а не нормамі і крытэрыямі, якія навязваюць з-за мяжы. «У нас не стаяла задачы знайсці пэўныя недахопы, парушэнні, а потым спрабаваць крытыкаваць гаспадароў гэтага дома», — дадаў ён.

Сяргей Лебедзеў заўважыў, што дэпутацкія выбары ў Беларусі прайшлі арганізавана, спакойна, без парушэнняў, у святочнай атмасферы і актыўна. «Актыўнасць выбаршчыкаў — пацвярджэнне вялікай цікавасці грамадзян Беларусі да выбараў, імкнення прыняць удзел у выбары тых кандыдатаў, якія садзейнічалі б спраўджванню планаў і чаканняў грамадзян Беларусі, паляпшэнню іх сацыяльнага становішча, — падкрэсліў ён. — Мы спадзяёмся, што тыя парламентарыі, якія былі выбраны, могуць задаволіць чаканні беларускіх грамадзян і садзейнічаць прасоўванню Беларусі наперад».

Сяргей Лебедзеў рэзюмаваў, што выбары ў нашай краіне 25 лютага 2024 года праведзены ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. «Адкрыта і галосна, прайшлі на альтэрнатыўнай аснове, былі празрыстымі і справядлівымі, адпавядалі прынцыпам правядзення дэмакратычных выбараў, — удакладніў кіраўнік місіі. — Гэтыя выбары забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян Рэспублікі Беларусь».

### «Выбары з'яўляюцца важным крокам на шляху далейшага палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь»

Міжнародныя назіральнікі ад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ажыццяўлялі назіранне за выбарамі дэпутатаў у Беларусі з 22 да 26 лютага. У складзе місіі было акрэдытавана 20 назіральнікаў ад дзяржаў — членаў ШАС. Назіральнікі наведалі 121 участак для галасавання. Яны наведвалі выбарчыя ўчасткі без папярэдняга апавяшчэння выканаўчых і выбарчых органаў Беларусі. Выбар участкаў для наведвання ажыццяўляўся членамі місіі самастойна, без пэўных перашкод. Усе заключэнні і высновы місіі заснаваны на асабістых назіраннях членаў місіі з розных дзяржаў і фактычных матэрыялах, сабраных падчас падрыхтоўкі да выбараў дэпутатаў, датэрміновага галасавання і непасрэдна ў асноўны дзень галасавання.

**Намеснік генеральнага сакратара ШАС, кіраўнік місіі назіральнікаў ад ШАС Нурлан ЕРМЕКБАЕЎ** адзначыў актыўнасць грамадзян у галасаванні, высокую яўку выбаршчыкаў у перыяд датэрміновага галасавання. Звернута ўвага на тое, што для выбаршчыкаў з абмежаванымі магчымасцямі былі створаны неабходныя ўмовы, адзначаны прафесійны ўзровень падрыхтоўкі мясцовых выбарчых органаў. Галасаванне, па меркаванні назіральнікаў ад ШАС, праходзіла ў спакойнай, добразычлівай атмасферы, без знешняга ціску і напружанасці. Назіральнікі ад ШАС адзначаюць патрыятычныя настроі грамадства на выбарчых участках, яднанне ўлады і народа.

«Выбары, якія адбыліся, з'яўляюцца важным крокам на шляху далейшага палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў кіраўнік місіі назіральнікаў ад ШАС. — Выбары адпавядалі патрабаванням выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь і прынятым краінай міжнародным абавязацельствам. Парушэнняў нормаў нацыянальнага заканадаўства, якія ставяць пад сумненне легітымнасць выбараў, місіяй не адзначана. Місія прызнае выбары, якія прайшлі, празрыстымі, праўдзівымі і дэмакратычнымі».

Афіцыйныя заявы міжнародных місій назіральнікаў будуць апублікаваны пасля афіцыйнага зацвярджэння вынікаў выбараў.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

Андрэй ХУДЫК:

# «ЭКАЛАГІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў ЦЭЛЫМ СПРЫЯЛЬНАЯ»

## Вынікі прыродаахоўнай дзейнасці за мінулы год падвялі ў Мінпрыроды

**На пашыраным пасяджэнні калегіі Мінпрыроды міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык агучыў асноўныя вынікі работы ведамства ў мінулым годзе. Так, у сферы аховы навакольнага асяроддзя ў 2023 годзе прынята больш за 75 нарматыўных прававых актаў, у тым ліку Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пяць законаў, два распараджэнні прэм'ер-міністра, 15 пастаноў Савета Міністраў, 55 пастаноў Мінпрыроды. Маштабная работа праведзена для падрыхтоўкі праекта Кантэпцыі Экалагічнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.**



Новы для нашай краіны дакумент накіраваны на сістэматызацыю актаў заканадаўства ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і ўстанаўленне прыярытэту прыродаахоўнага заканадаўства над прыродарэсурсным, а таксама прыярытэту аховы кампанентаў прыроднага асяроддзя над іх выкарыстаннем у працэсе гаспадарчай і іншай дзейнасці.

Забяспечаны прырост запасаў нафты, базальтаў, туфаў, суглінку, розных відаў пяску (для будаўніцтва, рамонту аўтамабільных дарог), торфу, прэсных і мінеральных падземных вод і інш. Падрыхтаваны і перададзены ў распрацоўку больш за 45 радовішчаў (іх частак) карысных выкапняў.

Праводзіліся розныя віды маніторынгу навакольнага асяроддзя Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь. Так, згодна з вынікамі маніторынгу якасці атмасфернага паветра, у гарадах яно значна палепшылася. Гэтаму садзейнічае кантроль за выкананнем мерапрыемстваў па скарачэнні выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу. Толькі за кошт рэалізацыі мерапрыемстваў па будаўніцтве, рэканструкцыі, мадэрнізацыі газаачышчальных установак выкіды ў 2023 годзе скараціліся на 4,4 тыс. тон.

***Дасягненні зводных мэтавых паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў на 2021—2025 гады»:***

- ***прырост рэсурсаў нафты — 457 тыс. т (182,8 % ад плана);***
- ***зніжэнне выкідаў парніковых газаў да ўзроўню 1990 года — 40 % (124 % ад плана);***
- ***рэалістычнасць кароткатэрміновых прагнозаў надвор'я па абласных цэнтрах — 95,9 % (на 3,1 % вышэй за план);***
- ***удзельная вага плошчы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ) у агульнай плошчы краіны — 9,1 % (100 % ад плана).***

Дэманструецца істотны прагрэс у пытаннях захавання і ўстойлівага выкарыстання біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці краіны. Забяспечана перадача пад ахову карыстальнікам 296 месцаў пасялення дзікіх жывёл і месцаў росту дзікарослых раслін, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, 16 555,5 га тыповых і (або) рэдкіх прыродных ландшафтаў, тыповых або рэдкіх біятопаў. На 1 студзеня 2024 года функцыянуе 1354 ААПТ.

Дзякуючы планамернай працы навукоўцаў з 4-га выдання Чырвонай кнігі было выключана 20 відаў дзікіх жывёл і 8 відаў дзікарослых раслін і грыбоў (у наступным выданні плануецца выключыць яшчэ 12 відаў жывёл і 26 відаў раслін). Прапануецца знізіць ахоўны статус для зубра еўрапейскага, рысі, барсука звычайнага, бурага мядзведзя і інш.

Адначасова працягваецца барацьба з інвазійнымі раслінамі. У справаздачны перыяд поўнасцю знішчана 743 месцы росту баршчэўніку Сасноўскага (647,4 га) і 1169 месцаў росту сумніку канадскага агульнай плошчай 566,1 га.

Добрыя вынікі і на міжнароднай арэне. У мінулым годзе Мінпрыроды рэалізоўвала пяць праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі (МТП) па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і змякчэння наступстваў змянення клімату з агульным бюджэтам больш як 15 млн долараў ЗША.

Працягнута работа па ахове і захаванні трансгранічнага аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча». У выніку 45-й сесіі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА было вырашана накіраваць у сакавіку ў нацпарк рэактыўную маніторынгавую місію ЮНЕСКА і Міжнароднага саюза аховы прыроды. Задачы візіту — праўдзенне аб'ектыўнай ацэнкі сітуацыі і выяўленне пагроз для прыроднага комплексу.

Апрача таго, прыродаахоўным ведамствам наладжваецца і развіваецца супрацоўніцтва з новымі замежнымі партнёрамі. Напрыклад, быў падпісаны пакет двухбаковых дакументаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя і геолагаразведкі з Кітаем і Венесуэлай.

Шмат увагі ўдзяляецца экалагічнай асвеце насельніцтва. Так, на 1 студзеня 2024 года 413 устаноў адукацыі маюць статус «Зялёная школа», 23 установы ўдзельнічаюць у праекце «Зялёныя класы беларускай сталіцы». Усяго за 2023 год арганізавана 2315 экалагічных мерапрыемстваў з удзелам каля 160 тыс. чалавек (больш за 30 тыс. з іх — моладзь і падлеткі).

Напрыканцы калегіі міністр падкрэсліў:

— Неабходна сур'ёзная праца — як у цэнтральным апараце, так і на месцах. Толькі комплекснае развіццё ўсіх кірункаў прыродаахоўнай дзейнасці дасць магчымасць дабіцца максімальнага эфекту ад іх рэалізацыі і забяспечыць высокую якасць навакольнага асяроддзя і спрыяльныя ўмовы для жыцця людзей. Асабліва гэта важна ў Год якасці.

Мерапрыемствы завяршыліся цырымоніяй узнагароджання калектываў арганізацый і работнікаў сістэмы Мінпрыроды, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у выкананне задач ведамства.

**Александрына ПАРШЫНА.**
**Фота Андрэя КАРАБЕЛЬНІКАВА.**

Актуальна

# Скараціўся аб'ём спажывання прыроднага газу

## Пра гэта паведаміў міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ

**«Зніжэнне аб'ёму спажывання прыроднага газу за мінулы год у параўнанні з узроўнем 2022-га склала амаль 10 %, або каля 1,7 мільярда кубічных метраў», — паведаміў Віктар Каранкевіч на выніковай калегіі міністэрства. Па яго словах, у першую чаргу гэта звязана з работай Беларускай атамнай станцыі. Другі фактар — комплекс энергазберагальных мерапрыемстваў, якія рэалізуюцца ў краіне і таксама даюць свой эфект. У прыватнасці, у энергасістэме за кошт рэалізацыі такіх мерапрыемстваў сэканомлена больш за 110 тысяч тон умоўнага паліва. Трэці — гэта ўцягванне ў энергабаланс краіны мясцовых відаў паліва, якое таксама дазваляе замяшчаць выкарыстанне імпартаванага прыроднага газу.**

### БелАЭС выпрацавала звыш 25 млрд кілават

Кіраўнік Мінэнерга праінфармаваў, што ў мінулым годзе арганізацыі галіны выканалі дадзеныя ўрадам заданні і ключавыя паказчыкі, забяспечылі надзейнае забеспячэнне энергарэсурсамі спажыўцоў рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва. Працягвалася сістэмная работа па абнаўленні асноўных вытворчых фондаў арганізацый энергетычнага комплексу, павышэнні надзейнасці работы энергасістэмы. Пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы рэалізаваныя важныя для галіны інвестыцыйныя праекты.

Самай маштабнай падзеяй стаў увод у прамысловую эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі. З моманту ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму першага энергаблока станцыя выпрацавала 25,4 мільярда кВт•г электрычнай энергіі. Гэта дазволіла замясціць звыш 6,7 мільярда кубічных метраў прыроднага газу. Праект стаў добрым стымулам для росту электрычнага спажывання ў краіне — па выніках 2023 года гэты паказчык вырас на 2,5 мільярда кВт•г, або на 6,6 % у параўнанні з 2022 годам і склаў 41,1 мільярда кВт•г. Пры гэтым 28,5 % ад агульнага аб'ёму забяспечана за кошт выпрацоўкі электраэнергіі Беларускай атамнай станцыяй.

Рост электраспажывання забяспечаны як рэальным сектарам эканомікі, так і насельніцтвам. Гэта развіццё энергаёмістых вытворчасцяў, электратранспарту, выкарыстанне электраэнергіі для мэт ацяплення і гарачага водазабеспячэння.

### Будуць пашыраны работы па мадэрнізацыі электрасетак

«Для задавальнення ўзрослых патрэбнасцяў у электраэнергіі рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва ў краіне шырока праводзяцца работы па рэканструкцыі электрасеткавай інфраструктуры. У 2022 годзе энергазабеспячальнымі арганізацыямі пабудавана і мадэрнізавана 1,7 тысячы кіламетраў электрасетак, а летась — ужо каля 2,7 тысячы кіламетраў. Сёлета стаіць задача павялічыць гэты аб'ём да трох тысяч кіламетраў», — сказаў Віктар Каранкевіч.

Разам з мадэрнізацыяй электрасетак працягваюцца работы па рэканструкцыі падстанцый розных класаў напружання. Большасць з гэтых праектаў рэалізавана з ужываннем найноўшых тэхналогій аўтаматызацыі і лічбавізацыі, што істотна павышае надзейнасць энергазабеспячэння спажыўцоў.

На чатырох буйных электрастанцыях — Бярозаўскай і Лукомльскай ГРЭС, Наваполацкай ЦЭЦ і Мінскай ЦЭЦ-5 — завяршыліся асноўныя работы па будаўніцтве пікава-рэзервовых энергетычных крыніц з устаноўкай высокаманеўранага генеравальнага абсталявання сумарнай магутнасцю 800 МВт.



### Газіфікавана каля 13 тысяч кватэр і дамоў

Газазабяспечвальнымі арганізацыямі ў 2023 годзе ўведзена ў эксплуатацыю каля адной тысячы кіламетраў газаправодаў розных катэгорый, газіфікавана прыродным газам каля 13 тысяч кватэр і домаўладанняў. Блакітнае паліва падведзена да 56 сельскіх населеных пунктаў, з іх 17 — аграгарадкі. Агульная працягласць газавых сетак перавышае 67 тысяч кіламетраў.

Праведзена комплекснае прыборнае абследаванне 8,5 тысячы кіламетраў падземных газаправодаў. У мэтах павышэння бяспекі абанентаў — карыстальнікаў прыроднага газу на газавых стаяках і ўводах заменена 13,8 тысячы адзінак нацяжных кранаў на шаравыя. Заменена 154 тысячы адзінак маральна састарэлага бытавога газавага абсталявання.

### Торфу хопіць усім, яшчэ і на экспарт застаецца

Арганізацыямі тарфяной галіны летась здабыта 2,2 мільёна тон торфу. За справаздачны перыяд выраблена больш за 1,2 мільёна тон тарфяной прадукцыі паліўнага і каля 136 тысяч тон непаліўнага прызначэння. Патрэбы ўнутранага рынку задаволены ў поўным аб'ёме. Вялася сістэмная работа і па развіцці экспарту. Летась на знешнія рынкі адгружана 150 тысяч тон тарфяной прадукцыі на суму звыш 12 мільёнаў долараў. Пастаўкі ажыццяўляліся больш чым у 20 краін.

### Пляцоўка для сховішча радыеактыўных адходаў пакуль не вызначана

Як адзначыў кіраўнік Мінэнерга, пляцоўка для размяшчэння рэспубліканскага сховішча радыеактыўных адходаў пакуль не вызначана. Ідзе аналіз раёнаў і тэрыторый, дзе яно патэнцыйна магло б размясціцца. Пры гэтым улічваюцца ўсе аспекты: экалагічныя, эканамічныя, сацыяльныя, арганізацыйныя, тэхнічныя.

У гэтую работу актыўна ўцягнутая Беларуская арганізацыя па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі.

Першую чаргу сховішча плануецца ўвесці ў эксплуатацыю да 2030 года. Перад пачаткам будаўнічых работ будуць арганізаваны грамадскія слуханні па праекце ў Беларусі, а таксама разам з сумежнымі дзяржавамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Блізкая ўлада

# Падарунак жыхарам Віцьбы

**Эфектыўнасць прамых тэлефонных ліній, якія праводзяць прадстаўнікі кіраўніцтва вобласці, — на канкрэтных прыкладах рэальнай дапамогі. Так, у снежні мінулага года на гарачую лінію да старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра СУБОЦІНА звярнуліся жыхары пасёлка Віцьба, што пад Віцебскам, з праблемай недахопу ў населеным пункце крамы і аптэкі. І ўжо ў лютым, напярэдадні адзінага дня галасавання, жыхары пасёлка выправіліся па першыя пакупкі ў новыя гандлёвыя аб'екты.**



Фота «Витебские вести».

Магазін агульнай плошчай каля 300 квадратных метраў адкрылі ў пасёлку, дзе пражываюць больш за 420 чалавек, пасля звароту мясцовых жыхароў на прамую тэлефонную лінію да кіраўніка паўночнага рэгіёна. Усе з нецярпеннем чакалі ўводу аб'екта ў строй. Працяглы час на гэтым месцы пуставала былая крама Віцебскай універсальнай базы.

Ва ўрачыстым адкрыцці гандлёвага аб'екта прынялі ўдзел старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін, старшыня Віцебскага райвыканкама Сяргей Ягораў, начальнік Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг аблвыканкама Ірына Ляўковіч, генеральны дырэктар ЗАТ «Дабраном» Алег Бялінскі, генеральны дырэктар УП «Фармацыя» Кацярына Барысіевіч, іншыя афіцыйныя асобы, шматлікія жыхары пасёлка — бацькі з дзецьмі, пажылыя людзі.

Звяртаючыся да прысутных, Аляксандр Субоцін падкрэсліў, што было нялёгка вырашыць гэта пытанне, паколькі не кожная сетка пойдзе туды, дзе магчымыя рызыкі нерэнтабельнай працы. І пакідаць пасёлак без крамы ў крокавай даступнасці, дзе пражывае больш за 400 чалавек, таксама не маглі. Рашэнне было знойдзена з дапамогай сеткі ЗАТ «Дабраном», якое зрабіла рэканструкцыю будынка, дзе акрамя крамы будзе працаваць і аптэка сеткі «Фармацыя». Гэта знакавая падзея для пасёлка.

— Няма сумневу, што гандлёвы аб'ект з аптэкай унутры, размешчаны недалёка ад трасы, будзе запатрабаваны мясцовымі жыхарамі, турыстамі ў летні перыяд, каб набыць прадукты і неабходныя лекі, — падкрэсліў кіраўнік вобласці. — Гэты прыклад паказвае, што толькі сумеснымі намаганнямі можна вырашаць падобныя пытанні, наводзіць парадак на даручанай тэрыторыі і ў краіне.

У краме прадстаўлена каля 2,5 тысячы найменняў тавараў: гаспадарчага прызначэння, напоі, кандытарскія і хлебабулачныя вырабы, малочная і мясная прадукцыя, крупы, кансервы, паўфабрыкаты, свежая гародніна і садавіна, а таксама тавары для хатніх гадаванцаў. У аптэцы плошчай 26 квадратных метраў таксама ёсць шырокі асартымент: лекавыя прэпараты, вырабы медыцынскага прызначэння, біялагічна актыўныя дабаўкі, медтэхніка.

Крама ў крокавай даступнасці пад брэндам «Капеечка» ў пасёлку Віцьба яшчэ і юбілейная, 155-я на Віцебшчыне, падкрэсліў генеральны дырэктар ЗАТ «Дабраном» Алег Бялінскі. Гэта дазволіла стварыць сем дадатковых працоўных месцаў. Памяшканне светлае, прасторнае, з даступнымі вітрынамі і стэлажамі, на якіх размешчана больш за дзве тысячы найменняў тавараў паўсядзённага попыту.

Вяскоўцы падзякавалі Аляксандру Субоціну за садзейнічанне і вырашэнне іх пытання. «Для Віцьбы гэта знакавае мерапрыемства. Для людзей, якія тут жывуць і едуць у гэты бок, гэта, напэўна, адзіны пункт, дзе можна па шляху на лецішча, у вёску закупіцца прадуктамі, лекамі. Я думаю, мы зрабілі гэта для сябе, усе разам», — адзначыў кіраўнік Віцебшчыны.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

Інвестыцыі

# ЗДАРОЎЕ, СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА І ІНФРАСТРУКТУРА

## Уладзімір Каранік расказаў, як будзе развівацца Гродзенскі рэгіён

**У 2023 годзе Гродзеншчына палепшыла асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Рост ВУП склаў 6,6 %, больш чым на 100 % павялічыліся інвестыцыі ў асноўны капітал, значна выраслі прыбыткі. Усё гэта дазволіла сфарміраваць прафіцытны бюджэт. Летась удалося выканаць усе ўзятыя абавязацельствы і нават зрабіць звыш плана. Істотныя аб'ёмы работ запланаваны на сёлетні год. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК вызначыў асноўныя аспекты дзейнасці і ўвядзенне новых аб'ектаў інфраструктуры на 2024 год.**

### ФЕРМЫ І ДАРОГІ

У вобласці вядзецца маштабны працэс рэканструкцыі аб'ектаў жывёлагадоўлі. Больш за 80 % пагалоўя знаходзіцца на сучасных комплексах, яшчэ 15 будуюцца. Амаль столькі ж будзе ўведзена па выніках мінулага года разам з першым кварталам 2024-га.

Сур'ёзныя рэсурсы сёлета будуць накіраваны на рамонт і ўтрыманне дарог, пры тым што ў мінулым годзе іх фінансаванне было павялічана ў два разы.

— Вядзецца работа па часовым рамонце дарог і ямачны рамонт, каб павялічыць бяспеку для кіроўцаў. З паляпшэннем надвор'я дарогі будуць прыводзіцца ў парадак, у тым ліку ў кварталах індывідуальнага будаўніцтва. Ёсць дамова з гарвыканкамам, што на працягу двух гадоў там прывядуць у парадак усе гравійныя дарогі. Далей гэта работа будзе весціся з удзелам саміх жыхароў. Сумесна папрацуем над тым, каб там быў пракладзены асфальт, бардзюрны камень, — акрэсліў перспектывы Уладзімір Каранік.

### МЕМАРЫЯЛ

У Гродне запланавана рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу «Шталаг-324». На месцы былога лагера смерці на ўскраіку Гродна ў 60-я гады была ўстаноўлена бетонная стэла. Падчас памятных дат тут праходзяць масавыя мерапрыемствы. Між тым гэта месца не да канца добраўпарадкавана. Не вызначаны адпаведным чынам брацкія магілы, няма спісаў загінулых вязняў.



Згодна з планам рэканструкцыі, будуць праведзены работы па добраўпарадкаванні агульнай магілы, з'явяцца інфармацыйныя таблицы, навядуць парадак у цэлым на тэрыторыі комплексу. Плануецца, што работы будуць завершаны да Дня Перамогі.

### МЕДЫЦЫНА

Кіраўнік рэгіёна расказаў аб галоўных будаўнічых праектах аховы здароўя.

Важнай падзеяй стане адкрыццё ў Гродне клініка-дыягнастычнага корпуса абласнога анкадыспансера з устаноўкай КТ, МРТ, радыенуклідный дыягностыкай. Летась тут запусцілі радыелагічны корпус. Такім чынам, вядзецца паэтапны выхад на праектную магутнасць. У далейшым пачнецца рэканструкцыя тэрапеўтычнага корпуса. Па словах губернатара, медыцынская ўстанова стане адной з самых сучасных у краіне.

У сакавіку плануецца завяршыць рэканструкцыю хірургічнага корпуса ўніверсітэцкай клінікі. Працягваюцца работы ў корпусе клінічнага цэнтра «Фтызіятрыя». Вядзецца актыўнае будаўніцтва аддзялення хуткай дапамогі абласнога кардыялагічнага цэнтра, дзе будзе ўстаноўлена навейшае абсталяванне, каб мець магчымасць эфектыўна дапамагаць пацыентам, якія знаходзяцца ў крытычным стане.

Працягваецца рамонт гарадскіх бальніц абласнога цэнтра. У сувязі з тым, што размясціць на іх плошчах высокатэхналагічнае абсталяванне не заўсёды магчыма, прынята рашэнне аб будаўніцтве новай клінікі, дзе з'явяцца магутная пульманалагічная, кардыялагічная, эндакрыналагічная і іншыя службы, два КТ, МРТ, ангіёграф.

### ЦЭНТР СПОРТУ, ЗАГС, САДОК

Адным з маштабных праектаў, які плануецца ажыццявіць у Гродне, стане шматфункцыянальны спартыўны комплекс. Як зазначыў кіраўнік рэгіёна, тут будзе дзве пляцоўкі. Асноўная на дзве тысячы гледачоў дазволіць праводзіць міжнародныя спаборніцтвы па ўсіх гульнявых відах спорту, другая пляцоўка на 500 месцаў — трэніровачная. Таксама будзе 50-метровы басейн з тэрмальнымі зонамі. У далейшым цэнтр можна развіваць, напрыклад, дабавіць крытыя тэнісныя корты, харчовыя аб'екты, гасцініцу. Фінансаванне аб'екта закладзена ў абласную інвестыцыйную праграму.

Магчыма, вызначаць і лёс былога Палаца тэкстыльшчыкаў у цэнтры Гродна. З гэтым велічным будынкам улады вызначаюцца не першы год. І вось нарэшце яго лёс атрымаў перспектыву. Мяркуецца, што будынак зробяць Палацам для заключэння шлюбу. Акрамя функцый ЗАГСа, аб'ект стане месцам для правядзення знакавых мерапрыемстваў, канферэнцый, выставак.

Зрушыўся з месца і праект па рэканструкцыі басейна «Лазурны». Тут плануецца стварыць цэнтр воднага адпачынку, у тым ліку сямейнага, дзе змогуць адпачыць да 160 чалавек за гадзіну. У планах — як дарожкі, так і водныя горкі, некалькі джакузі, дзіцячыя басейны з атракцыёнамі, СПА-зоны з лазнямі і саўнамі, салярная пячора і іншае. Аб'ект будзе інклюзіўна адаптаваны. Тэрмін яго здачы ў эксплуатацыю — 2025 год, а кошт работ — 12 мільёнаў рублёў.

Сёлета здадуць у эксплуатацыю адзін з самых вялікіх дзіцячых садкоў рэгіёна. Ён разлічаны на 335 дзяцей. Будаўніцтва вядзецца ў самым маладым мікараёне Грандзічы-3, які актыўна забудоўваецца. Кошт аб'екта складае 16 мільёнаў рублёў. На будаўнічыя работы накіравана на сёння амаль шэсць мільёнаў. Тут будзе ліфт, басейн, каля 20 гульнявых пляцовак — адпаведнасць усім сучасным патрабаванням.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

У дарогу

# З БРЭСТА Ў МАСКВУ — ЗА ГАДЗІНУ СОРАК ПЯЦЬ

## «Белавія» адкрывае прамыя рэйсы

**Старт палётаў запланаваны на 3 красавіка. Рэйсы па маршруце Брэст — Масква (Шарамецьева) — Брэст будуць выконвацца два разы на тыдзень: па серадах і суботах на паветраным судне Embraer-175 з камфартабельным салонам эканом- і бізнес-класа. Пра гэта паведаміў журналістам начальнік Брэсцкага філіяла дзяржаўнага прадпрыемства «Белаэранавігацыя» Аляксандр ДАКУЧЫЦ.**



Вылет з Брэста плануецца ў 16.35, прылёт у Маскву — каля 18.20. З Масквы самалёт будзе вылятаць у 13.45, у Брэст прыляціць у 15.40. Кошт білета пачынаецца ад 46 еўра. У абодва бакі паездка абыдзецца ў 85 еўра, што параўнальна з коштам паездкі па чыгунцы. Гэта самы нізкі тарыф — без багажу, толькі з ручной паклажай. Вядома, з багажом у бізнес-класе ляцець будзе даражэй. Пасажыр сам выбірае ўзровень камфорту.

Брэсцкі аэрапорт засумаваў па актыўнай рабоце. Тут не прымалі рэгулярныя рэйсы з 2019 года. Чартарнай турыстычнай праграмы не было з 2021 года. А раней самалёты з Брэста лялі ў Турцыю, Егіпет, іншыя краіны. Аўтар гэтых радкоў некалькі гадоў таму магла ўпэўніцца на прыкладзе палёту ў Чарнагорыю, як гэта зручна — адпраўляцца ў адпачынак прама з дому, а не траціць дадатковыя дні на дарогу.

Некалі ляталі і ў Расію. Апошні рэйс у Маскву быў ажыццёўлены ў 2010 годзе расійскай авіякампаніяй. І вось цяпер камунікацыя аднаўляецца, як было заўважана, па просьбах жыхароў першага рэгіёна. Зацікаўленасць выказвалі і бізнес-супольнасць, і дзелавыя колы, і шматлікія турысты. Спецыялісты кажуць, што гэты напрамак надзвычай перспектыўны, бо з Масквы можна дабрацца фактычна ў любы пункт свету.

Як зазначыў кіраўнік філіяла «Белаэранавігацыя» Аляксандр Дакучыц, увесь гэты час аэрапорт утрымліваецца ў добрым стане, гатовы да выканання рэйсаў. Ды ён і не закрываўся, працаваў за кошт прыватных і бізнес-пералётаў.

Да новай нагрузкі падрыхтоўка не спатрэбілася. Узлётна-пасадачная паласа, рулёжная дарожка, перон — усё пасля нядаўняй рэканструкцыі. Прапускная здольнасць аэравакзала складае 200 чалавек у гадзіну. У будучым колькасць рэйсаў можа быць павялічана да чатырох, пяці ў тыдзень. Праграма разлічана на жыхароў Брэста і Брэсцкага рэгіёна, а таксама Гродзенскай вобласці, грамадзян Расіі. Аднаўляюцца ў гэтым сезоне і палёты ў Турцыю. Турыстычныя кампаніі ўжо запрашаюць на адпачынак з вылетам з Брэста ў Анталью 13 мая. У аэрапорце паведамілі, што напрамкі — Санкт-Пецярбург, Мінеральныя воды і іншыя курорты — зараз на стадыі прапрацоўкі. Але цалкам верагодна, што ўжо гэтым летам пачнуцца палёты ў названыя гарады.

На сайце кампаніі «Белавія» гэтая навіна пачынаецца словамі: «Мы ведаем. Вы чакалі».

— Сапраўды, так, — пацвердзіла мая расійская знаёмая Марына Гуранда. — Кожнае лета я выбіраю турыстычную паездку з заездам у Брэст. У ваколіцы абласнога цэнтра застаюцца дарагія мне магілы. Дарога не блізкая. З Ніжняга Ноўгарада дабіраюся ў Маскву, затым поездам еду ў Брэст. Думаю, што скарыстаюся самалётам.

— Калі гавораць, што рэйс адкрылі па просьбах жыхароў першага рэгіёна, то гэта і пра нас, — сказала жыхарка Брэста Ніна Васьковіч. — Мой унук вучыцца ў Маскве. Дачка з зяцем ездзяць туды па справах бізнесу. Цяпер з'яўляецца магчымасць эканоміць час, ажыццяўляць паездкі з большым камфортам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении **29 марта 2024 года** торгов с условиями по продаже **магазина промышленных товаров в г. Жодино**

| Предмет торгов |
|---|
| Изолированное помещение с инвентарным номером 612/D-19448 общей площадью 534,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а, помещение № 1 (1-й этаж) (назначение: **торговое помещение**) |
| Начальная цена: 1 389 440,00 бел. руб. |
| Сумма задатка: 138 900,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Продавец имущества (собственник):** Атрахимович С.И., гражданин Республики Беларусь.

**Условие торгов (условие продажи):** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по продаже торгового помещения в г. Жодино.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за один календарный день до наступления даты проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **29 марта 2024 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.02.2024 по 26.03.2024 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (по вопросам участия в аукционе и ознакомления с имеющейся документацией);**
**(029) 568-34-20 (по вопросу осмотра продаваемого имущества);**
**(029) 856-29-19 (по иным вопросам).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00031** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026, г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 27.03.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196220 площадью 459 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-21, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.
**Нач. цена: 382 400,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 38240,00 бел. руб.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196221 площадью 67 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-22, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.
**Нач. цена: 57 360,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 5736,00 бел. руб.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-196222 площадью 77,3 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4-23, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение. Наличие мест общего пользования.
**Нач. цена: 66 480,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 6648,00 бел. руб.**

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-141307 площадью 92,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4-1В, наименование – помещение многофункциональное, назначение – помещение многофункциональное. Наличие мест общего пользования.
**Нач. цена: 22 260,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 2226,00 бел. руб.**

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-141311 площадью 41,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4-1Е, наименование – складское помещение, назначение – складское помещение, помещение между 1-м–2-м этажами. Наличие мест общего пользования.
**Нач. цена: 20 143,47 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 2014,34 бел. руб.**

Объекты находятся на земельном участке с кадастровым № 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда).

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в повторных электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами:** <u>**до 16.00 26.03.2024.**</u>

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с №** BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и независимой экспертизы внутренней оценки, и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, <u>оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов</u>.

*Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по лотам №№ 1–3 – 646,80 бел. руб. с НДС по каждому лоту, по лотам №№ 4–5 составляют 638,64 бел. руб. с НДС по каждому лоту.*

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

***Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 35»***

<u>**28 марта 2024 года в 15.00**</u>
**состоится годовое собрание акционеров**
## ОАО «Стройтрест № 35»,

**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск ул. Я. Коласа, 38 четвертый этаж, актовый зал.**

**Повестка дня собрания**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год и основных направлениях деятельности на 2024 год.
**2.** О работе наблюдательного совета Общества в 2023 году.
**3.** О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год.
**4.** Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2023 год.
**5.** Об утверждении порядка использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2023 год. О выплате дивидендов за 2023 год.
**6.** Об утверждении плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2024 год и первый квартал 2025 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2024 году.
**7.** Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**8.** О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**9.** О внесении изменений в Устав Общества.
**10.** О внесении изменений в локально-правовые акты Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск ул. Я. Коласа, 38 в кабинете заместителя председателя Наблюдательного совета с 7 марта по 27 марта 2024 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании по состоянию реестра на 12 марта 2024 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100289278

**ОАО «Гомельоблреклама» (продавец) извещает о проведении <u>12 марта 2024 года открытого</u> <u>повторного аукциона с понижением на 50 %</u> по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9**

**Лот № 1:**
**капитальное строение, инв. № 350/С-42579**
общей площадью 232,7 кв. м,
наименование: **здание автоматизированного склада цемента,**
назначение: **здание специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ,**
расположенное по адресу:
**Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 7/5.**

**Информация о земельном участке:**
расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000000604801 площадью 1,0851 га.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 27.02.2024 по 07.03.2024 с 9.00 до 16.00.**

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.12.2023 г. № 235 (300965).

**Контактные данные: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 400071204

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества ОДО «ФАРМИН» (УНП 190073936), объявляет о проведении **28.03.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
### (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона Северный в г. Минске». 2-я очередь.»)

**В опубликованную 13 октября 2023 г. в газете «Звязда» № 199 проектную декларацию (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона Северный в г. Минске». 2-я очередь.») внести следующие изменения**

1. Первый абзац раздела «Информация о проекте и об объекте строительства» изложить в следующей редакции:

«Цель проекта – строительство 3 блокированных жилых домов с привлечением к строительству жилых помещений граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и имеющих право на внеочередное получение государственной поддержки, по направлениям соответствующих администраций; при невостребованности – граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска, организациях г. Минска, без выдачи таких направлений, при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске.»

2. Четвертый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

«Квартиры предназначены для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (по направлениям администраций районов г. Минска), при невостребованности – с гражданами, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска, организациях г. Минска (без выдачи таких направлений при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске), строятся с выполнением подготовительных работ под декоративную отделку стен, полов и потолков, без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды и тепла), без полотенцесушителя, без установки патронов под приборы освещения в жилых комнатах, без электрической плиты.»

3. Пятнадцатый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

«Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска и осуществляющих строительство при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске:

- в жилом доме № 1.2 по генплану – 3 051,38 руб.;
- в жилом доме № 1.3 по генплану – 3 067,92 руб.;
- в жилом доме № 1.4 по генплану – 3 071,33 руб.»

4. Двадцатый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

«Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 473 от 10 декабря 2018 г. Гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и в организациях г. Минска, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается **6 (шесть) четырехкомнатных квартир**, из них

**в ж. д. № 1.2 (по генплану):**
кв. № 2 общей площадью 109,60 м² жилой площадью 60,09 м²;
**в ж. д. № 1.3 (по генплану):**
кв. № 4 общей площадью 109,52 м² жилой площадью 60,09 м²,
кв. № 5 общей площадью 109,52 м² жилой площадью 60,09 м²,
кв. № 7 общей площадью 109,52 м² жилой площадью 60,09 м²,
кв. № 8 общей площадью 109,60 м² жилой площадью 60,09 м²;
**в ж. д. № 1.4 (по генплану):**
кв. № 3 общей площадью 109,52 м² жилой площадью 60,09 м².»

5. Раздел «Характеристика объекта» дополнить абзацем:

«В случае расторжения заключенных ранее договоров создания объектов долевого строительства по направлениям администраций районов г. Минска, с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, из числа многодетных семей, при невостребованности на освобождившиеся квартиры принимаются граждане, состоящие на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях г. Минска, организациях г. Минска, при наличии справки о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий в г. Минске.»

6. Первый абзац раздела «Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир» изложить в следующей редакции:

«Прием заявлений от граждан осуществляется отделом реализации недвижимости ОАО «МАПИД» (г. Минск, пр-т Жукова, 6, кабинет № 1, тел. 209-87-52) **с 5 марта 2024 года,** ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.»

7. Второй абзац раздела «Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир» изложить в следующей редакции:

«Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина, его паспорт, справка (с уточнением учетных данных) о постановке на учет нуждающихся в администрациях г. Минска, организациях г. Минска.»

УНП 100008115

# «АБЯЦАЮЦЬ ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ І МЕРЫ КАНСПІРАЦЫІ, АЛЕ ЎСЕ ЗАКЛАДЧЫКІ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА»

## Праваахоўнікі расказалі, як маладых людзей вярбуюць для распаўсюджвання наркотыкаў і чым гэта звычайна заканчваецца

**Колькасць злачынстваў у галіне незаконнага абароту наркотыкаў паступова зніжаецца, у тым ліку ўцягнутасць непаўналетніх. Аднак спецыялісты не рэкамендуюць заспакойвацца. Вельмі часта распаўсюджвальнікамі і спажыўцамі становяцца маладыя людзі з добрых сем'яў, з вышэйшай адукацыяй і без фінансавых праблем. Легкадумныя паводзіны пасля абарочваюцца вялізнымі тэрмінамі пазбаўлення волі. Прыклады, калі людзі, у якіх у жыцці было ўсё, атрымалі па два дзясяткі гадоў пазбаўлення волі, прывялі праваахоўнікі.**

### АСНОЎНЫ АКЦЭНТ — НА ІНТЭРНЭТ-КРАМЫ

У 2023 годзе назіралася зніжэнне злачыннасці ў сферы незаконнага абароту наркотыкаў на 20 %, у тым ліку па выяўленні цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў.

— Мы канстатавалі скарачэнне колькасці заяў, якія паступілі ў органы ўнутраных спраў, якія датычыліся незаконнага абароту наркотыкаў, змяншэнне колькасці наркаманаў, якія знаходзяцца на ўліку, скарачэнне колькасці асоб, якіх дастаўлялі ва ўстановы аховы здароўя з перадазіроўкамі (на 10 %), смяротнасці ад перадазіроўкі наркотыкамі (на 33 %), — пералічвае **начальнік аддзела па кантролі за наркотыкамі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама Кірыл БЯРКОЗАЎ.** — Таксама зменшылася колькасць навучэнцаў і студэнтаў, якія былі прыцягнутыя да адказнасці, і ўцягнутасць у незаконны абарот наркотыкаў непаўналетніх (на 32 %). Падобная сітуацыя і з раней асуджанымі, што абумоўлена правядзеннем маштабнай прафілактычнай работы.

Летась сталічнымі аператыўнікамі было выяўлена 16 каналаў пастаўкі наркотыкаў у Беларусь (усе яны з Расіі), 27 памяшканняў, спецыяльна прыстасаваных для вырошчвання наркаўтрымлівальных раслін, адна лабараторыя па вырабе псіхатропных рэчываў. Таксама спынена дзейнасць 11 інтэрнэт-магазінаў па продажы наркотыкаў (у 2022-м іх было 8).

— Асноўны акцэнт мы робім на рабоце ў гэтым кірунку, паколькі такая структура наркабізнесу як інтэрнэт-магазіны са сваёй іерархіяй прысутнічаюць на тэрыторыі нашай краіны. Мы імкнёмся ліквідаваць магазін, каб ён не ўцягваў моладзь у супрацьпраўную дзейнасць, — падкрэсліў Кірыл Бяркозаў.

За мінулы год у сталіцы было канфіскавана 230 кг псіхатропных рэчываў і наркатычных сродкаў, што амаль у пяць разоў больш у параўнанні з 2022 годам. У 60 % выпадкаў пераважалі наркотыкі сінтэтычнага паходжання — альфа-PVP, мефедрон, на другім месцы — наркотыкі расліннага паходжання — гашыш, марыхуана. Кірыл Бяркозаў дадаў, што ў сталіцы рэгулярна праводзяцца мерапрыемствы па адпрацоўцы месцаў масавага адпачынку моладзі. Разам з аператыўнікамі ў іх удзельнічае кінолаг з сабакам. На дыскатэках, у начных клубах і іншых установах летась выяўлена 46 злачынстваў. Гэтая работа працягваецца і сёлета.

### СЯРЭДНЯЯ ПРАЦЯГЛАСЦЬ РАБОТЫ ЗАКЛАДЧЫКА — 2-3 МЕСЯЦЫ

З развіццём у сталіцы сістэмы відэаназірання, а таксама павышэннем пільнасці грамадзян збыт наркотыкаў змяшчаецца за межы Мінскай кальцавой аўтадарогі. Аднак, улічваючы што насельніцтва Мінска плацежаздольнае, сюды сцякаецца вялікая колькасць збытчыкаў.

Збыт наркотыкаў цягам апошніх гадоў у 95 % выпадкаў ажыццяўляецца праз інтэрнэт.

— Як правіла, вярбоўка непаўналетніх адбываецца праз розныя месенджары, сацыяльныя сеткі. Некаторыя крамы не хаваюць, што трэба будзе раскладваць забаронены тавар, а некаторыя завуаліравана прапануюць раскладваць легальны тавар, пры гэтым абяцаючы добры заробак. Але і ў такім выпадку ўсе разумеюць, што гэта ўцягванне ў збыт наркотыкаў, — адзначае прадстаўнік сталічнай міліцыі.

Для таго каб уладкавацца кур'ерам, перавозчыкам, закладчыкам у такія крамы, трэба прайсці працэдуру ідэнтыфікацыі асобы. Малады чалавек фатаграфуецца з вокладкай пашпарта, і толькі пасля гэтага крама прапануе яму работу на пэўных умовах.

— Абяцаюць вялікія грошы і меры канспірацыі. Але, як правіла, сярэдняя працягласць работы закладчыка-мінёра — 2-3 месяцы, і, як правіла, усе яны затрымліваюцца, — адзначае Кірыл Бяркозаў.

Ён нагадаў, што адказнасць у Беларусі за ўдзел у незаконным абароце наркотыкаў наступае з 14 гадоў, максімальнае пакаранне — да 25 гадоў пазбаўлення волі.

У прафілактычнай рабоце, акрамя міліцыі, задзейнічаны медыцынскія і адукацыйныя ўстановы, служба працы і сацыяльнай абароны. І гэта дае свой вынік: у апошнія гады менш выяўляецца злачынстваў з удзелам непаўналетніх.

Органы ўнутраных спраў таксама праводзяць прафілактычную работу, пачынаючы ад выступленняў ва ўстановах адукацыі да сустрэч у працоўных калектывах. Бо выхаванне ў дзіцяці



навыкаў супрацьстаяць прапановам незаконнага абароту наркотыкаў найперш залежыць ад бацькоў.

Два гады таму пры падтрымцы Мінгарвыканкама ў цэнтры бяспекі МНС на вуліцы Олешава, 2 у Мінску была адкрыта антынаркатычная пляцоўка. Толькі летась яе наведала 14 тысяч дзяцей і падлеткаў. Яна складаецца з двух блокаў, першы — сітуацыя ў начным клубе, другі — гісторыя асуджанага. Гэта 3D mapping — мадэль, дзе наведвальнік візуальна трапляе ў пэўную сітуацыю і яму ў даступнай форме расказваецца пра наступствы і адказнасць.

### НА ПОВАДЗЕ Ў «КУРАТАРАЎ»

Як удакладніў **начальнік аддзела лінейнага працэсуальнага кантролю Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па горадзе Мінску Аляксей ДАЎЖОНАК,** кожнае чацвёртае злачынства, якое здзяйсняецца ў Беларусі ў сферы незаконнага абароту наркотыкаў, здзяйсняецца ў сталіцы. У 2023 годзе ўзбуджана 1055 крымінальных спраў, што на 24 % менш, чым у 2022 годзе. Непаўналетнія здзейснілі 12 злачынстваў, раней судзімыя — 131, асобы ў стане алкагольнага ап'янення — 32, наркатычнага ап'янення — 231, жанчыны — 52, непрацоўныя і навучэнцы — 352.

Летась следчыя падраздзяленні Мінска ўнеслі 238 прадстаўленняў у розныя арганізацыі па месцы работы і вучобы асоб, якія здзейснілі злачынствы. Па выніках іх разгляду пяць службовых асоб прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасці.

— Найчасцей да збыту наркотыкаў прыцягваюць людзей маладога ўзросту — ад 20 да 30 гадоў, а таксама непаўналетніх. Ім абяцаюць лёгкі заробак, сродкі канспірацыі, лёгкія грошы: атрымлівай вялікія аб'ём наркотыкаў, фасуй па маленькіх пакетах, раскладвай. Такія асобы ўстанаўліваюцца даволі аператыўна, ад некалькіх дзён да некалькіх месяцаў, — адзначыў Аляксей Даўжонак. — Аналізуючы асобы правапарушальнікаў, мы прыходзім да высновы, што гэта маладыя людзі з добрых сем'яў, якія не маюць праблем з законам, у іх ёсць грошы, але разам з тым яны падпадаюць на такі лёгкі дадатковы заробак і ідуць на повадзе ў куратараў інтэрнэт-крамаў.

У якасці прыкладу прадстаўнік Следчага камітэта прывёў крымінальную справу, па якой абвінавачана 20-гадовая жыхарка сталіцы. Яна паддалася на ўгаворы адміністратараў наркашопа, скінула фота свайго пашпарта, запісала відэа, прайшла выпрабавальныя іспыты і атрымала заданне на буйную партыю наркотыкаў. Яе неабходна было забраць дадому, расфасаваць і раскласці на дробныя дозы. Забіраючы дадзены «клад», яна заўважыла, што на яе звярнулі ўвагу маладыя людзі, спалохалася, выкінула і наркотыкі, і тэлефон.

— Але «куратары» на яе выйшлі, сталі пагражаць, у тым ліку і «спорткамі», якія яе могуць знайсці і прычыніць фізічныя пакуты. І скідвалі відэа такіх расправ у адносінах да іншых закладчыкаў. Дзяўчына падпарадкавалася, ранейшую партыю наркотыкаў не знайшла, але атрымала новае заданне: забрала яшчэ адну буйную партыю, расфасавала і падчас закладкі больш дробных доз была затрыманая супрацоўнікамі міліцыі, — расказаў Аляксей Даўжонак.

### САМЫ НЕБЯСПЕЧНЫ — МЕТАДОН

У 2023 годзе крымінальных спраў, якія пацягнулі смерць, было 32 (годам раней — 46). Сярод загінулых 29 мужчын і чатыры жанчыны. Смерць наступала як ад метадону, так і ад камбінаванага атручвання, калі сумесна ўжываліся і іншыя наркотыкі.

— Адказнасць у такім выпадку нясе асоба, якая збыла рэчыва загінуламу, яна наступае па частцы 5 артыкула 328, дзе максімальнае пакаранне — да 25 гадоў пазбаўлення волі, — нагадаў Аляксей Даўжонак.

Нядаўна скончана расследаванне ў адносінах пяці ўдзельнікаў арганізаванай групы, якія пад кіраўніцтвам «куратара» ажыццяўлялі незаконную дзейнасць. Паводле прыгавору суда, ім прызначаны тэрміны ад 12 да 18 гадоў.

Таксама вынесены прыгавор па справе незаконнага абароту метадону ў буйным памеры, што пацягнула смерць па неасцярожнасці двух чалавек. Адміністратарам інтэрнэт-крамы вынесена пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 21 і 23 гады, а таксама буйным штрафам у 1000 базавых велічынь і маральнай кампенсацыяй на карысць маці аднаго з загінулых у памеры 50 тысяч рублёў.

— Скончана крымінальная справа ў адносінах маладога чалавека, ураджэнца Мінска, які працаваў у Маскве ў сферы IT. У Беларусь ён прыязджаў, каб патраціць зробленыя грошы. У знятую кватэру запрасіў пяцярых знаёмых, маладыя людзі сумесна праводзілі час, ужывалі алкаголь. Абвінавачаны прапанаваў метадон, які загадзя набыў. Ён высыпаў рэчыва ў агульную талерку і ўсе яго ўжывалі, у тым ліку 26-гадовая дзяўчына. Пасля ўжывання некаторыя пакінулі кватэру, засталося двое маладых людзей і гэтая дзяўчына. Ёй стала дрэнна, яна пачала крычаць і бегаць. Адзін з хлопцаў спалохаўся і пакінуў кватэру, другі не звяртаў увагі, пакуль яна не страціла прытомнасць. Ён выклікаў «хуткую» і стараўся аказаць дапамогу, але дзяўчына загінула. Абвінавачаны, вярнуўшыся, пастараўся прыбраць сляды, але яны былі сабраны, заведзена крымінальная справа. Максімальнае пакаранне, якое пагражае абвінавачанаму, — 25 гадоў, — прывёў яшчэ адзін прыклад Аляксей Даўжонак.

### ЯК ЗАПАДОЗРЫЦЬ УЖЫВАННЕ?

Ёсць некалькі прыкмет, па якіх можна зрабіць высновы, што блізкі ўжывае наркотыкі.

— Варта паглядзець тэлефон вашага дзіцяці: якія сайты наведвае, якія праграмы маюцца. Звярнуць увагу, ці ёсць у яго банкаўскія карты на іншых людзей, ці ёсць у тэлефоне фотаздымкі ўчасткаў мясцовасці. Калі ў доме з'явіліся электронныя вагі, зіп-пакеты, пальчаткі, гэта сведчыць, што дзіця ўцягнута ў незаконны абарот наркотыкаў, — адзначыў Кірыл Бяркозаў.

Насцярожыць павінны і перамены ў знешнім выглядзе.

— Найперш, пашыраныя ці звужаныя зрэнкі, бледнасць скурных покрываў, праблема са сном і апетытам. Калі падлетак пачынае блытаць час сну і няспання, доўга спіць днём, можна западозрыць, што ён ужывае наркатычныя ці псіхатропныя рэчывы, — дадае **дзяржаўны медыцынскі судовы эксперт-хімік упраўлення дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па горадзе Мінску, кандыдат біялагічных навук, дацэнт Вольга ВЯРГУН.** — Характэрна пагаршэнне знешняга выгляду — чалавек перастае даглядаць сябе, рэдка пераапранаецца. І, вядома, змены ў паводзінах. Гэта і агрэсіўнасць, непрызнанне нормаў паводзінаў. Таксама характэрна павелічэнне расходаў, падлетак раптам пачынае прасіць наяўныя сродкі на неабгрунтаваныя пакупкі. Калі ў доме ўзнікаюць падазроныя прадметы — кубачкі, пакецікі, — таксама варта насцярожыцца.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЗМЯНЕННІ КЛІМАТУ: прычыны і перспектывы

**Антрапагенны вугляродны след, зялёная эканоміка, лес — лёгкія планеты, глабальнае пацяпленне, парніковы эфект, квоты на выкіды вугляроду — і гэта далёка не поўны пералік штампаў, якія літаральна штодня гучаць у інфармацыйнай прасторы. Большасцю яны ўжо ўспрымаюцца як аксіёма, а ці так гэта на самай справе?**

**У наш час грамадству навязваецца пастулат аб віне чалавецтва ў змяненні клімату, пры гэтым заклікаюць скарачаць выкіды $CO_2$ аж да нулявых паказчыкаў, укараняць «зялёныя тэхналогіі», выкарыстоўваць альтэрнатыўныя вуглевадароднай сыравіне энергетычныя крыніцы, а нязгодным пагражаюць рознымі эканамічнымі пакараннямі.**

**Нядаўна каля 1600 навукоўцаў, якія ўваходзяць у Global Climate Intelligence Group, падпісалі і апублікавалі Сусветную кліматычную дэкларацыю, падкрэсліўшы, што антрапагеннае змяненне клімату — гэта міф. Яны лічаць, што навука аб клімаце павінна быць менш палітызаванай, у той час як кліматычная палітыка — больш навуковай. Варта адкрыта гаварыць пра няпэўнасці і перабольшанні ў прагнозах глабальнага пацяплення, у той час як палітыкі павінны непрадузята падлічваць рэальныя выдаткі, а таксама меркаваныя выгады.**

**Асабліва эксперты адзначылі, што з таго часу, як існуе Зямля, яе клімат пастаянна мяняўся. Зусім нядаўна — у 1850 годзе — яна перажыла «малы ледніковы перыяд», таму нядзіўна, што цяпер мы назіраем перыяд пацяплення. Што да парніковых газаў, то яны карысныя для планеты, у прыватнасці, $CO_2$ неабходны для ўсяго жыцця на Зямлі, надзвычай спрыяльны для прыроды і фактычнага азелянення. Дадатковы выкід $CO_2$ прыводзіць да росту глабальнай расліннай біямасы, павялічвае ўраджайнасць сельгаскультур.**

**Удзельнікі Global Climate Intelligence Group заклікаюць перастаць безагаворачна верыць вынікам разлікаў кліматычных мадэляў і тым больш выкарыстоўваць іх як палітычныя інструменты. Навука аб клімаце вырадзілася ў дыскусію, заснаваную на веры, эрозія якой выразна адлюстроўваецца ў пісьме аўтараў.**

**Выказаць сваё меркаванне на праблему антрапагеннага фактару ў змяненні клімату пагадзіўся галоўны навуковы супрацоўнік Цэнтра кліматычных даследаванняў Інстытута прыродакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Уладзімір ЛОГІНАЎ.**



***— Уладзімір Фёдаравіч, дык усё ж пацяпленне ёсць ці яго няма?***

— Апошнія восем гадоў былі самымі цёплымі ў свеце за ўсю гісторыю назіранняў. Пра гэта сведчаць вынікі шасці вядучых міжнародных баз тэмпературных даных, аб'ядданыя Сусветнай метэаралагічнай арганізацыяй (СМА). Сярэдняя глабальная тэмпература ў 2022 годзе была прыкладна на 1,15 °С вышэй за даіндустрыяльны (1850—1900 гады) узровень. Гэта афіцыйныя звесткі, якімі многія аперыруюць. Але давайце не забываць, што рады гідралагічных параметраў, што выкарыстоўваюцца, далёка не заўсёды з'яўляюцца аднастайнымі, паколькі ступень пакрыцця зямнога шара пунктамі назіранняў за апошнія 100–150 гадоў моцна адрозніваецца.



Прычын гэтаму шмат: войны, рэвалюцыі, сацыяльна-эканамічныя ўзрушэнні. Апошняе значнае памяншэнне шчыльнасці сусветнай гідраметэаралагічнай сеткі адбылося ў 1980-я гады. У асобных рэгіёнах скарачэнне станцый даходзіла да 50—60 %. А вось аднаўленне метэаралагічнай сеткі апошнія дзесяцігоддзі ідзе вельмі марудна. Да таго ж, як правіла, закрываліся ў першую чаргу пункты, размешчаныя ў аддаленых і цяжкадаступных раёнах. У выніку суадносіны колькасці гарадскіх станцый да сельскіх і цяжкадаступных зрушыліся на карысць першых. Такім чынам, «урбанізацыйная» папраўка ў сукупных радах гідраметэаралагічных характарыстык станавілася ўсё большай і ў шэрагу раёнаў магла дасягнуць каля 0,1 °С. Як разумееце, нават з улікам аднаго гэтага фактару катэгарычная высновa Міжнароднай групы экспертаў — «У вышэйшай ступені верагодна (95—100 %), што ўплыў чалавека з'яўляецца дамінантнай прычынай назіранага пацяплення з сярэдзіны XX стагоддзя», — патрабуе дадатковых доказаў.

Што да натуральных тэмпературных ваганняў, то, вядома ж, яны ёсць. Мы жывём у дынамічнай кліматычнай сістэме. Вядома, у гісторыі Зямлі былі, ёсць і будуць цыклічныя ваганні. Але неабходна ўсведамляць, што на фоне сапраўды значных для планеты знешніх і ўнутраных кліматычных фактараў рознач асовага маштабу нават самы найстарэйшы доўгажыхар, у лепшым выпадку, толькі матылёк-аднадзёнка. Пакуль мы валодаем недастатковым аб'ёмам інфармацыі, каб адназначна нешта спрагназаваць. І гэта так, таму што любы працэс мае трэндавую (спрагназаваць працэй), цыклічную (змяняе амплітуду і фазу) і, самае важнае, выпадковую кампаненту, якую немагчыма спрагназаваць у прынцыпе.

***— На што ж арыентавацца ў кліматычных пытаннях?***

— Па-першае, не варта спекуляваць на адной з тэорый, спрабуючы ўзвесці яе ў абсалют. Навука развіваецца на аснове супярэчнасцяў, вядома нямала прыкладаў, калі аўтарытэт аднаго вучонага, чыё імя можа быць упісана ў гісторыю залатымі літарамі, спыняў прагрэс на працяглы тэрмін. Так, доўга лічылася аксіёмай, што сонечная актыўнасць не ўплывае на фарміраванне магнітных бур на Зямлі, паколькі напружанасць магнітнага поля Сонца згасае з павелічэннем адлегласці r3. Але вось з'явіліся работы аб «умарожанасці» магнітнага поля ў патокі зараджаных часціц, якія паступаюць у калязямную касмічную прастору і выклікаюць адхіленне поля Зямлі... І ўсё стала на свае месцы. Але колькі гадоў мінула, перш чым навукоўцы зразумелі працэсы і змянілі свае погляды!

Па-другое, прызнаючы, што кліматычныя змяненні — гэта аб'ектыўная рэальнасць, але, не маючы пакуль магчымасці фарміравання дакладных прагнозаў, неабходна прапрацоўваць розныя сцэнарыі развіцця падзей. Чым больш будзе ўлічана фактараў і чым больш дасканалымі стануць кліматычныя мадэлі, тым больш эфектыўна зможам выкарыстоўваць гэтыя вынікі. Прычым гаворка ідзе не толькі аб непасрэдна кліматычных прагнозах, але і аб адаптацыйных мерах для кліматазалежных галін эканомікі як на выпадак пацяплення, так і пахаладання.

Час зразумець, што надышла новая кліматычная анамальнасць і да яе трэба прыстасоўвацца. Прычым галоўным чынам шляхам пераадолення тэхналагічнай адсталасці.

***— А парніковыя газы, зялёная эканоміка, антрапагенны вугляродны след — як да гэтага ставіцца?***

— Уплыў парніковых газаў на змяненне сучаснага клімату апошнія 30—40 гадоў лічу даказаным. Але я ведаю, што існуючыя мадэлі, дзе яны прызнаюцца дамінантным фактарам, не могуць адэкватна апісаць змены планетарнага і рэгіянальнага клімату першай паловы мінулага стагоддзя і больш ранніх гадоў. Роля шэрагу натуральных і антрапагенных фактараў, напрыклад аэразолю, вядомая з вялікай доляй няпэўнасці. Што датычыцца такога элемента парніковага газу, як вуглякіслы газ, то яшчэ ў другой палове 80-х гадоў мінулага стагоддзя С. Ідсо напісаў кнігу «Вуглякіслы газ: сябар ці вораг?», дзе паказаў значнасць вуглякіслага газу ў павелічэнні прадукцыйнасці біялагічных сістэм. Гэтыя даследаванні прадоўжыліся і ў наступныя гады. Іх актуальнасць не выклікае сумненняў.

Аб патэнцыяле дрэў у абароце вугляроду мне меркаваць цяжка, я не біёлаг. Магчыма, варта было б разглядаць іх па-за дадзеным аспектам. Роля лясоў настолькі шматгранная, што, нават калі яны раптам у выніку акажуцца не такімі эфектыўнымі паглынальнікамі вуглякіслага газу, як бы камусьці сёння не хацелася, гэта зусім не будзе азначаць, што лесамеліярацыя не актуальная. Лясы даюць жыццё і сродкі існавання шматлікім жывым арганізмам. Неабходна іх берагчы і памнажаць.

Што да зялёнай эканомікі, альтэрнатыўных энергетычных крыніц, другаснай перапрацоўкі смецця, скарачэння забруджвання планеты рознымі адходамі вытворчасці, то тут і без глабальнага пацяплення зразумела, што гэта неабходна рабіць. Лепш жыць у чыстым і бяспечным доме, чым у брудным і запушчаным. Але, на мой погляд, вызначальнымі ў гэтым кірунку будуць два фактары — навукова-тэхнічны прагрэс і ўзровень самасвядомасці людзей, заснаваны на навуковых ведах і пачуцці сацыяльнай адказнасці.

А вось над палітызацыяй праблемы змянення клімату варта сур'ёзна ўсім задумацца. На жаль, геапалітычны складнік гэтай найважнейшай навуковай праблемы стаў дамінаваць. Маніпуляванне разлікамі, атрыманымі пры мадэляванні з многімі няпэўнымі зыходнымі данымі, і прыдумванне заведама невыканальных паказчыкаў могуць у выніку вельмі дорага каштаваць усяму чалавецтву. Добрая мэта дэкарбанізацыі пачынае трансфармавацца ў інструмент міжнароднага ціску на краіны і навязванне ім эканамічных рашэнняў, якія не адпавядаюць нацыянальным інтарэсам, ды і ўзроўню іх тэхналагічнага развіцця. Яскравы прыклад — Кіёцкі пратакол. Дакумент, падпісаны ў 1997 годзе, прадугледжваў, што выкіды парніковых газаў развітымі краінамі і краінамі з пераходнай эканомікай будуць скарочаныя на 5 % адносна 1990 года. Але да канца 2012 года — тэрмін дзеяння пратакола, як паказаў час, выкіды выраслі на 49 %! У 2015 годзе ў Парыжы было падпісана новае пагадненне. Заяўленая мэта — утрымаць рост сярэдняй тэмпературы ў рамках 2 °С, а пры магчымасці — не вышэй за 1,5 °С у параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем. Для гэтага краіны павінны перайсці на шлях нізкавугляроднага развіцця і пераарыентацыі фінансавых патокаў на карысць галін і тэхналогій з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў і/або якія садзейнічаюць іх скарачэнню. Планы амбіцыйныя, але чым яны забяспечаны? На мой погляд, выдаткі павінны быць на парадак большымі, чым прагназуюцца. Зноў жа, як і што лічыць, калі няпэўнасць зыходнай інфармацыі нікуды не падзелася.



Важна падкрэсліць, што Парыжскае пагадненне ўжо прэтэндуе не на рэкамендацыйны, а на юрыдычна абавязвальны дакумент. Навязванне краінам абавязацельстваў у фармаце абсалютнага скарачэння выкідаў, прымушэнне да выкарыстання нізка- і безвугляродных тэхналогій і актыўнай экалагізацыі розных сектараў эканомікі — гэта ўжо яўны дыктат. Прычым невыкананне абавязацельстваў можа скончыцца ізаляцыяй, рознымі санкцыямі, што, натуральна, толькі пагоршыць агульную эканамічную сітуацыю. Акадэмік Расійскай акадэміі навук Леапольд Лабкоўскі правільна сказаў: «Так, прыхільнікам глабальнага пацяплення ўдалося пераканаць сусветную супольнасць і ўрады многіх краін, што прычынай змянення клімату з'яўляюцца антрапагенныя выкіды вуглякіслага газу. Калі не скароцім, то наступствы будуць катастрафічнымі: затапленне мегаполісаў, засухі, неўраджаі, голад, эпідэміі і г. д. Выйсце адно — зялёная эканоміка, квоты на выкіды і далей па спісе. А фактычна гэта пераход чалавецтва да новага светапарадку, дзе некалькі краін будуць устанаўліваць свае правілы гульні, спасылаючыся на клімат». Як бачыце, праблема змянення клімату з экалагічнай сферы пакуль усё больш дрэйфуе ў палітыка-эканамічную.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ,**
**фота аўтара.**

# НАТУРПРАДУКТ У СПАДЧЫНУ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тое ж самае і ў сельскай гаспадарцы: па ўсім свеце шырокае распаўсюджванне атрымалі інтэнсіўныя тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур з актыўным прымяненнем хімізацыі і ўраджаі павысіліся да неймаверных, як тады здавалася, велічынь. Але прагрэс (і ў медыцыне, і ў аграрнай сферы, і ў шматлікіх іншых) апынуўся, на жаль, медалём з двума бакамі. І сёння аб харчовай, у прыватнасці, бяспецы людзі гавораць не толькі з пазіцый колькасці. Калі дозы ўгнаенняў і сродкаў аховы раслін дасягнулі дзясяткаў кілаграмаў на гектар, медыкі забілі трывогу і на першы план выйшлі пытанні якасці і «экачысціні» таго, што мы ядзім. У прыродных біяцэнозах адсутнічаюць натуральныя сістэмы нейтралізацыі злучэнняў, атрыманых у выніку хімічнага сінтэзу, сцвярджалі медыкі. Жорстка эксплуатаваць зямлю і не вяртаць ёй узятае — шлях у нікуды, дадавалі эколагі. Для вытворчасці здаровай ежы трэба браць у саюзнікі мікраарганізмы і бактэрыі, а жорсткія «хімічныя» тэхналогіі пакінуць у мінулым, паўтаралі і тыя, і другія. Словам, усё новае — добра забытае старое. А прыгадаць яго дапамагаюць старыя кнігі.

Дарэчы, родапачынальнікам арганічнага падыходу да земляробства (у сучасным разуменні) у Беларусі можна лічыць якраз класіка нашай літаратуры — Якуба Коласа. У 1950-х пісьменнік актыўна «земляробнічаў» на сваім прысядзібным участку. Але, як чалавек выключна таленавіты і энцыклапедычна адукаваны, і да гэтага пытання ён падышоў, як сёння сказалі б, крэатыўна. Па легендзе, ураджаі, якім дзівіліся суседзі, ён атрымліваў па тэхналогіі... 1611 года. Крыніцай натхнення для класіка паслужыла работа «Хроніка Еўрапейскай Сарматыі» сярэднявечнага гісторыка Аляксандра Гваньіні, выдадзеная ў пачатку XVII стагоддзя па-польску ў Кракаве. Гэта адно з першых дэталёвых геаграфічных, эканамічных і геапалітычных апісанняў ВКЛ. У прыватнасці, там падрабязна расказваецца аб старажытных спосабах земляробства на тэрыторыі сучасных Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Па шляху Коласа сёння ідуць супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь (дзе, дарэчы, у аддзеле рэдкіх кніг ёсць работа Гваньіні, а таксама мноства кніг і перыёдыкі, карысных сучаснаму «эказемляробу»). Клімат, вядома, змяняецца, але старыя спосабы па-ранейшаму надзвычай працуюць на дачных участках, запэўніваюць яны.

— Сучасныя агароднікі-садаводы шукаюць адказы на свае пытанні ў інтэрнэце, — адзначае **намеснік дырэктара Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Ала ПЕНДА.** — Але за дакладнасць інфармацыі ў інтэрнэце ніхто не адказвае. Асабіста я — а я таксама агароднік-аматар — карыстаюся іншымі крыніцамі. Напрыклад, выданнямі, якія выходзілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў блакадным Ленінградзе, у Маскве, а пасля вызвалення БССР — і ў нашай рэспубліцы. Акадэмія навук СССР працавала і падчас вайны, у яе складзе былі і беларускія навукоўцы. Просты мовай, літаральна «пакрокава» вучоныя тлумачылі, як выгадаваць высокія ўраджаі: накарміць краіну і армію тады было першачарговай задачай. Памылак у гэтых кнігах і артыкулах няма і быць не можа, таму што цаной памылкі для навуковых супрацоўнікаў у тыя гады было, без перабольшання, жыццё. Каштоўна і тое, што гэтыя выданні разлічаныя ў першую чаргу на людзей без аграрнай адукацыі, у тым ліку гарадскіх жыхароў. Так, у блакадным Ленінградзе кожны кветнік станавіўся градкай і ўраджаі, па ўспамінах відавочцаў тых падзей, былі годнымі.




**Можна звярнуцца да выданняў тых часоў, калі спосабы земляробства па вызначэнні былі «эка».**

Можна звярнуцца і да больш ранніх выданняў, гаворыць суразмоўніца. Чытаць старадаўнія тэксты ці нават тэксты больш «маладыя», але з «яцямі», спадабаецца не кожнаму. Але вось артыкулы і брашуры 1930-х лёгкія для сучаснага чытача, а спосабы земляробства тады апрыёры былі «эка».

## ЦЁПЛЫЯ ГРАДКІ ДЛЯ ТАМАТАЎ І РАДЫСКІ

А яшчэ карысна перад «пасяўной на ўласных градках» пагартаць старыя падшыўкі газет.

— Асаблівасцю БССР у 1930—1940-х гадах быў высокі інтарэс менавіта да прэсы, газет і іншых перыядычных выданняў, ва ўсіх пластах грамадства, — распавядае Ала Пенда. — І для беларускага чытача агратэхналогіі тлумачылі менавіта газеты. Вось, напрыклад, артыкул у «Советской Белоруссии» за 4 сакавіка 1945 года, які распавядае аб цёплых градках для таматаў. Калі вы лічыце, што цёплыя градкі прыдумалі «на нашай памяці», вы памыляецеся.

У артыкуле «Больш ранняй гародніны» за аўтарствам начальніка садавіна-агароднінага ўпраўлення Наркамзема БССР М. Хабенкі паведамляецца, што тэхналогія дазваляе атрымаць прадукцыю нашмат раней, чым у няўцепленым грунце.

— І гэта праўда: як кажуць, праверана на сабе, — пацвярджае Ала Пенда.

«Усе віды ўцепленага грунту неабходна размяшчаць на месцах узвышаных, добра асветленых сонцам, абароненых з паўночнага і ўсходняга бакоў. Спачатку пракладваецца шырокая і глыбокая разора, у якую накладваецца гарачы гной пластом 25—30 см. Да гною з бакоў прывальваецца зямля і разраўноўваецца граблямі. На ноч пасевы на ўцепленым грунце ўкрываюцца мешкавінай, рагожай, саламянымі матамі. Уздоўж град або грабянёў забіваюцца калкі, і да іх прымацоўваюцца тычыны, на якіх трымаецца сховішча. На ўцепленым грунце вырошчваюцца таматы, агуркі, радыска, салата, цыбуля. Расаду таматаў можна высаджваць на ўцепленыя грады ў першых чыслах мая. Пасадка здзяйсняецца нахільна ўздоўж грады на адлегласці 18 см рад ад раду і расліна ад расліны. Пад расаду таматаў гной выкладваецца ў градкі пластом да 40—50 см. Па заканчэнні замаразкаў расліны паднімаюць і прывязваюць да калоў».

Агуркі лепш вырошчваць на ўцепленых грабянях, для якіх наразаюцца разоры шырынёй да 50 см, у іх укладваецца гной пластом да 20 см над паверхняй зямлі. Зямлю прыкочваюць з бакоў, апраўляюць грабянямі так, каб на краях утвараліся ўзвышэнні. Уздоўж сярэдзіны грэбня праводзяць дзве баразёнкі, у якія высаджваецца расада агуркоў. На ноч грабяні ўкрываюць».

Пасеў радыскі на ўцепленыя градкі ажыццяўляюць у пачатку красавіка. Пасевы накрываюцца да з`яўлення ўсходаў, потым укрыцці на дзень здымаюцца, паведамляе крыніца.

«Пры наяўнасці тарфяна-гнаявых збанкоў пасеў насення на расаду можна пачынаць раней, затым высаджваць на градкі расаду больш дарослую, што яшчэ паскорыць атрыманне ўраджаю». Тут жа апісана, як такія збанкі зрабіць самастойна (хоць у наш час купіць іх не праблема, але калі мы жадаем весці агарод аўтэнтычна — дык хай ужо будзе аўтэнтычна). Рэцэпты розныя. Напрыклад, дзве часткі торфу, дзве часткі каровінага гною і адна частка дзярновай зямлі.

## ДРУГІ ХЛЕБ — ЯК МАГА РАНЕЙ

Вялікі артыкул за красавік 1945-га прысвечаны яравізацыі (прарошчванню) насеннага матэрыялу бульбы ранніх сартоў — «аднаму з найважнейшых мерапрыемстваў па вырошчванні высокіх і максімальна ранніх ураджаяў гэтай культуры». Прапануюцца два спосабы — на святле па метадзе акадэміка Лысенкі і ў вільготным асяроддзі пры адсутнасці святла.

«Лепш за ўсё адбіраць клубні вагой не больш за 50—60 грамаў», раіць крыніца, «папярэдне вызваліўшы іх ад ужо наяўных парасткаў». Па Лысенку адабраныя і прасушаныя клубні ўкладваюцца ў памяшканні з тэмпературай 12—15 градусаў пластом да 20 см (святло пакуль не патрэбна). Як толькі вочкі крануцца ў рост (2-3 мм), клубні раскладваюцца ўжо на святле ў адзін пласт і вытрымліваюцца пры той жа тэмпературы. Пазней тэмпературу змяншаюць да 10—12 градусаў. Да часу высадкі ў грунт парасткі павінны быць зялёнымі, дужымі, памерам 0,5—1 см. А зручней за ўсё, піша аўтар, нанізваць клубні для яравізацыі на тонкі дрот ці шпагат, апрацаваныя двухпрацэнтным растворам фармаліну. «Памеры знізак робяць рознымі: на дроце ў залежнасці ад вышыні памяшкання — да 3 м, на шпагаце — не больш за 1,5 м. Яравізацыю бульбы на шпагаце або дроце з поспехам можна праводзіць у кватэрных умовах, што вельмі каштоўна».

Спосаб яравізацыі ранняй бульбы ў вільготным асяроддзі быў распрацаваны Інстытутам бульбяной гаспадаркі. Асяроддзем можа служыць торф, мокрае пілавінне, саламяная дробная сечка. За 15—20 дзён да высадкі ў грунт клубні выкладваюцца пластом у адзін клубень у такі вільготны грунт пры тэмпературы 16—17 градусаў. «Да канца яравізацыі клубні даюць масу моцных махрыстых каранёў, а парасткі павінны быць не больш за 2-3 см».

Апісаны і яшчэ адзін спосаб яравізацыі ранняй бульбы — у конскім гноі або сумесі конскага і каровінага гною (тэмпература ў бурце павінна быць не больш за 17—20 градусаў, а тэрмін яравізацыі — 14—16 дзён). Пасадка прарошчанай бульбы дапускаецца, калі глеба на глыбіні 10—12 см прагрэецца да 5-6 градусаў.


ДЕМОКРАТИЧЕСКАЯ РЕСПУБЛИКА!

ГОЛОСЪ ПОЛѢСЬЯ

Къ вамъ граждане великой свободной Россіи, къ тѣмъ изъ Васъ, кому дорого будущее нашей Родины, обращаемъ мы нашъ горячій призывъ.

Сильный врагъ глубоко вторгся въ наши предѣлы, грозитъ сломить насъ и вернуть страну къ старому, нынѣ мертвому строю.

Только напряженіе всѣхъ живыхъ силъ можетъ дать намъ желанную побѣду. Нужна затрата многихъ милліардовъ, чтобы спасти страну и завершить строеніе свободной Россіи на началахъ равенства и правды.

Не жертвы требуетъ отъ насъ Родина, а исполненія долга.

Одолжимъ деньги Государству, помѣстивъ ихъ въ новый заемъ, и спасемъ этимъ отъ гибели нашу свободу и достояніе.

ПОДПИСАЛИ:

**Агратэхналогіі часта тлумачылі газеты.**

## АГУРКІ: ВЯЛІКІЯ ЦІ МАЛЕНЬКІЯ?

Вырошчванню агуркоў у адкрытым грунце прысвечана выданне 1935 года Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута агародніннай гаспадаркі, якое пабачыла свет у Мінску. Апроч іншага, тут разглядаюцца розныя спосабы падрыхтоўкі арганічных угнаенняў «з падручных матэрыялаў», якія дазваляюць атрымліваць высокія ўраджаі. «Калгас «Чырвоны гароднік» (прыгарад Менска) ад прымянення ўгнаенняў з гарадскога смецця атрымлівае ўраджай агуркоў 370 цэнтнераў з гектара», паведамляе выданне.

«Іншы раз пасевы падаюць пад дзеянне ранішнікаў. Добрую страхоўку дае пасеў у два-тры тэрміны з прамежкам у пяць—восем дзён. Для пасеву намячаецца не адна, а дзве-тры баразёнкі. Адна засяваецца пры першым тэрміне пасеву, яна робіцца найбольш глыбокай. Другая — праз пяць дзён. Калі ёсць небяспека замаразкаў, пасеў праводзіцца і ў трэцюю баразёнку».

Брашуру ў далёкім 1935 годзе, відавочна, чыталі ўважліва: асобныя прапановы невядомы чытач падкрэсліў сінім хімічным алоўкам. Яго ўвагу прыцягнулі, напрыклад, такія парады навукоўцаў: «Пры рыхленні глебы ў радках вельмі карысна лёгкае акучванне раслін — да семядоляў. Пасля акучвання развіваюцца дадатковыя карані, якія жывяць і ўмацоўваюць расліны. Акучванне праводзіцца на вільготнай глебе»; «Паліваць патрэбна да поўнага прамочвання верхняга слою глебы. Слабае спырскванне глебы не толькі не прыносіць карысці, але нават шкодзіць»; «Ва ўсіх выпадках паліўкі вадкімі ўгнаеннямі трэба памятаць, што моцным растворам можна абпаліць карані. Таму ўгнойвальныя паліўкі прымяняюцца ў слабых растворах і па вільготнай глебе. Гнаевую жыжу трэба разбаўляць 3-4 часткамі вады»; «Вялікае значэнне для павышэння колькасці і якасці ўраджаю маюць паўтаральныя зборы пладоў праз 1-2 дні. Чым радзей і больш у беспарадку праводзяцца зборы, тым менш атрымліваецца агульны ўраджай па вазе».

— Цікавая дэталь, — тлумачыць суразмоўніца. — Сёння спажыўцу падабаюцца маленькія агурочкі — зеленцы або карнішоны. У пачатку і сярэдзіне мінулага стагоддзя, мяркуючы па друкаваных крыніцах, агуркі імкнуліся вырасціць большымі, перш чым сарваць (зразумела, не даўшы ім перасцець). Зрываць дробны плод было проста марнатраўна.

Цікавы і падбор сартоў, прапанаваных да вырошчвання на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Большасць з іх адышлі ў нябыт, але, напрыклад, «Нежынскія» агурочкі або народны сорт «Доўжык» (зараз ён селекцыяніраваны ў Інстытуце плодаагародніцтва з аднайменнага мясцовага сорту) дачнікі росцяць да гэтага часу.

Такія ж падрабязныя брашуры Усесаюзны інстытут агародніннай гаспадаркі выпускаў у 30-я гады мінулага стагоддзя па шматлікіх культурах — дыні, гарбузу, кавуну, тапінамбуру... Былі падобныя інструкцыі па садовых раслінах, па вырошчванні ягад і па пчалярстве. Азнаёміцца з парадамі амаль стагадовай даўніны для агароднікаў-садаводаў можна ў аддзеле старадрукаваных і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, у чытальную залу якой (у правым крыле Дома ўрада), паўторымся, пускаюць усіх, хто выкажа жаданне. І калі ўсё новае — добра забытае старое (а гэта, безумоўна, так), то, мабыць, менавіта ў старых выданнях дачнікі трэцяга тысячагоддзя адшукаюць мноства лайфхакаў для эказемляробства.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ВАЎКОЎ НЕ БАЯЦЦА — У ЛЕС ХАДЗІЦЬ

## Як прыцягнуць турыстаў нават у «нетурыстычны» сезон



**Нацыянальны парк «Прыпяцкі» знаходзіцца на тэрыторыі адразу трох раёнаў Гомельскай вобласці: Жыткавіцкага, Лельчыцкага і Петрыкаўскага. Штогод у парк прыязджае каля 110 тысяч наведвальнікаў з Беларусі і Расіі. Аматарам фота- і звычайнага палявання, рыбнай лоўлі і адпачынку на прыродзе прапанавана некалькі дзясяткаў розных тураў, экскурсій і фестываляў. Ёсць мерапрыемствы нават у такі неперспектыўны, на першы погляд, час, як люты. Штогод у гэты перыяд ладзіцца экафестываль «Ноч ваўкоў». Сёлета мне пашанцавала туды трапіць.**

...Мы выбіраемся з Мінска задоўга да світання — шлях няблізкі, але чатыры гадзіны да «Прыпяцкага» праляцяць як імгненне за кошт цікавай гутаркі са спадарожніцай. За бортам аўтамабіля свішчыць завіруха: буйныя снежныя камякі аблепліваюць лабавое шкло, размазваюцца ў белыя, зіхатлівыя ў святле фар палосы. Салодкая дрымота перапыняе размову напаўслове, і наступны раз я расплюшчваю вочы ўжо на подступах да Турава.

Старажытны горад праймае халодны сыры вецер. У мясцовай рацэ падняўся ўзровень вады, таму некаторыя раёны, асабліва Запясочнае, амаль што не ўсплылі. Шырокая сярэбраная стужка, скаваная з бакоў лёдам, павольна цячэ ўздоўж агародаў... Які ж характар трэба мець, каб столькі гадоў жыць тут!

У Тураве нас чакае арганізаванае нацпаркам снеданне. Палешукі — гасцінны народ: вылезці з-за стала, не паспытаўшы «першаедругое-трэцяе і кампот» — значыць, пакрыўдзіць гаспадароў, таму на турбазу «Хлупінская буда», дзе адбудзецца мерапрыемства, мы стартуем з невялікім спазненнем.

***Нацыянальны парк «Прыпяцкі» (агульная плошча — каля 200 тысяч га) заснаваны ў 1996 годзе. Місія — захаванне і комплекснае выкарыстанне ўнікальных і тыповых прыродных комплексаў і аб'ектаў Палесся, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці тэрыторыі. Апрача таго, у задачы нацпарка ўваходзіць аднаўленне парушаных прыродных комплексаў і аб'ектаў, якія маюць асаблівую экалагічную, гісторыка-культурную і эстэтычную каштоўнасць, і іх устойлівае выкарыстанне ў прыродаахоўных, навуковых, асветніцкіх, аздараўленчых, рэкрэацыйных і іншых мэтах.***

Наступны перапынак — ускраіна вёскі Хлупін. У лесе няма мабільнай сувязі, таму навігатар нам больш не памочнік. Пакуль кіроўца засяроджана ўзіраецца ў лабірынт дарог і вывучае маршрут, я даследую ваколіцу.

У адрозненне ад сталіцы, дзе яшчэ пануе зіма, вясна тут ужо ўступіла ў свае правы. Тут і там уперамешку з друзлымі, аселымі гурбамі снегу бачныя вільготныя карычневыя праталіны. Дрэвы ўздоўж дарогі "па калена" тонуць у цёмнай вадзе з выразным іржавым адценнем. У лесе тое ж самае, хіба што лужыны (а можа быць і балота) напаўпрыкрыты жаўтавата-шэра-белым, нібы васковы наплыў, лёдам. Дык вось чаму арганізатары заклікалі ўзяць з сабой зменнае адзенне і гумовікі!

***

У імправізаванай актавай зале шматлюдна. Экаасветніцкая лекцыя «Ваўка баяцца — у лес не хадзіць» аб звычках галоўнага героя фестывалю ў самым разгары. Выступае **Вольга ХАРЫТАНОВІЧ, спецыяліст па экалагічным турызме нацпарку, наш праваднік і гід падчас мерапрыемства:**

— Як людзі часцей за ўсё ўяўляюць ваўка? Крыважэрным разбойнікам, які нападае на чалавека. Але гэта далёка не так... Здаровы звер ніколі не праявіць агрэсію першым. Толькі калі яго справакавалі ці прымусілі бараніцца. Але асноўная маса нападзенняў здараецца ўсё ж па віне шалёных жывёл.

Воўк старанна выбірае ахвяру для палявання, паколькі яму даводзіцца эканоміць сваю энергію. Бо ў яго не заўсёды ёсць магчымасць кожны дзень есці дастаткова. Навуковыя даследаванні паказалі, што гэтыя звяры валодаюць незвычайнымі аналітычнымі здольнасцямі, што дазваляе ім прадумваць найбольш эфектыўную стратэгію нападу. Напрыклад, на ўскрайку пасецца статак казуль. Ваўкі могуць разбіць яго на некалькі частак і гнаць жывёл, каб вызначыць слабых (кульгавых, хворых, старых) і адбіць іх ад групы. Выбраць зручны момант для атакі і злавіць.

А ці ведаеце вы, што ў летні час рацыён ваўка на 50 % (у асобных папуляцыях. — **Заўв. аўт.**) складаюць мышы? Ваўкі ядуць ягады, грыбы, травы, карэнні. Не грэбуюць яшчаркамі, жабамі... Акрамя таго, у кожнай зграі свой рацыён, які залежыць ад жывёл, якія пражываюць на яе тэрыторыі. Калі тут больш баброў, будуць паляваць на іх, калі зайцоў, дык на зайцоў. Але! Ваўкі не забіваюць усіх, дапусцім, ласёў ці аленяў, у лесе ўшчэнт, інакш у будучыні яны застануцца без ежы. Гэты драпежнік умее пераключацца на іншую здабычу, калі колькасць асновы рацыёну прыкметна паменшылася (выключэнне — калі зусім няма дзічыны).

— А ці праўда, што ў ваўкоў ёсць альфа-самцы і альфа-самкі? — цікавіцца нехта з турыстаў.

— Не, даследаванні, якія будаваліся на гэтай тэорыі, праводзіліся сярод ваўкоў, якія жывуць у нявolі і сабраных з розных зграяў. У дзікай прыродзе воўчая зграя — гэта сямейная супольнасць, якая кіруецца парай бацькоў. Маладняк жыве з ёй да трох гадоў. Выпадкі, калі драпежнік усынаўляе ваўчанят з іншых зграяў, вельмі рэдкія. Зрэшты, бываюць і нестандартныя сем'і, дзе кіруюць два ваўкі і самка ці наадварот.

Вольгу засыпаюць пытаннямі аб ваўчынай вернасці, узаемаадносінах у зграі, колькасці асобін у нацпарку... Пасля нас чакае экаквэст «Логава» і вячэрняя экскурсія «Ваўчынымі сцежкамі». Разынка апошняй — удзел у ваўчыным канцэрце з дапамогай вабы. Калі пашанцуе, то мясцовыя «санітары лесу» адгукнуцца, а можа, і асабіста з'явяцца даведацца, што гэта за чужынцы зайшлі ў іх паляўнічыя ўгоддзі. Пасля прагулкі анансаваны вячоркі ля вогнішча і — ужо заўтра — майстар-клас па вырабе магнічкаў.

***Ваба — спецыяльная труба, якая дазваляе імітаваць ваўчынае выццё. Аднак дзьмуць у яе таксама трэба ўмець, інакш зрабіць праўдападобны для звера гук не атрымаецца.***

Што ж, паламаем пакуль галаву над загадкамі. Кожная, дарэчы, адначасова з'яўляецца падказкай, дзе шукаць наступнае заданне. Толькі самыя кемлівыя знойдуць след і прытулак звера.

Турбаза напаўняецца смехам, узбуджанымі воклічамі, тупатам. Турысты абследуюць плот і альтанкі, зазіраюць пад лаўкі і ў клумбы. Азартная мітусня працягваецца амаль да пяці гадзін вечара, калі нарэшце гучыць каманда «На выхад!»

***

Да пачатку маршруту (каля 5 км) мы прыбываем яшчэ завідна і адразу натыкаемся на адносна свежыя сляды драпежніка. Вольга тлумачыць, як адрозніць іх ад сабачых, вызначыць па іх узрост і пол жывёлы. Ваўкі бегаюць «у радок» — па прамой лініі. След у іх больш выцягнуты, а адбіткі сярэдніх пальцаў як бы адсякаюцца ад крайніх, так што паміж імі папярок следу можна пакласці тонкую палачку. Узрост і пол залежаць ад памеру лапы. Наш экзэмпляр — дарослы самец.

Акрыленыя знаходкай, працягваем шлях. Пад нагамі чвякае золь напалову з граззю, але хіба для тых, хто хоча прыгод, гэта перашкода? Тым больш што хвілін праз 25 нам зноў трапляюцца ваўчыныя, а потым і рысіныя сляды.

Падбіваю на размову сямейства Федзяракіных. Мінчане ў «Прыпяцкім» часныя госці: аднойчы прыехалі і... улюбіліся ў тутэйшую прыроду назаўжды.

— У раёне вёскі Ляскавічы высокі бераг Прыпяці. Ёсць міжледавіковыя геалагічныя адклады. Прыгожа — аж дух захоплівае! А разліў! Усе дубы ў вадзе, а ты плывеш паміж імі, як у «Палескіх рабінзонах». Ды і мерапрыемствы заўсёды цікавыя. Усё прадумана, зроблена з душой і для людзей, — дзеляцца ўражаннямі галава сям'і. — Да той жа «Ночы ваўкоў», напрыклад, арганізавана трохразовае харчаванне з магчымасцю выбару страў, пражыванне, трансфер, на турбазе ёсць пракат мангалаў і лазня. Апрача лекцыі, праводзяцца квэст, прагулка пешшу па начным лесе, майстар-клас, вячэрняя праграма каля вогнішча. На мой погляд, даволі ўдалае спалучэнне.

— На «Ночы ваўкоў», дарэчы, мы ўпершыню, — дадае яго жонка. — Але, упэўнена, дакладна не апошні раз. Тут цікава і падкупляе прыемная, дружалюбная атмасфера: нібыта і людзей шмат, аднак адчуваецца, што сабраліся аднадумцы. Да таго ж такія туры — выдатны дадатак да школьнай праграмы. Яны пашыраюць далягляд і дапамагаюць замацаваць атрыманыя веды. Наогул было б няздрэнна, калі б тут ладзілі тэматычныя мерапрыемствы для групавых заняткаў з дзецьмі (такая адукацыйная пляцоўка ўжо дзейнічае на базе Бярэзінскага біясфернага запаведніка. — **Заўв. аўт.**).

***Экалагічны адукацыйны пункт у Бярэзінскім біясферным запаведніку складаецца са спецыяльна абсталяванай аўдыторыі для тэарэтычных заняткаў і двух экалагічных маршрутаў з месцамі назірання за дзікай прыродай. Праект дазваляе дзецям на практыцы ўмацаваць тэарэтычныя веды ў галіне прыродазнаўства, атрыманыя ў школе.***

— А мы даведаліся пра фестываль праз «Інстаграм», — далучаецца да размовы экатурыстка Марыя Усік. — Наша сям'я як мага больш часу стараецца праводзіць на дзікай прыродзе. Шмат ходзім па Брэсцкай вобласці — наведваем азёры, балоты. На праграме пра жывёл упершыню — дачцэ толькі пяць гадоў, аднак ёй усё падабаецца. Так, Ніколь?

Дзяўчынка прызнаецца, што марыць убачыць ваўка. Наўрад ці асцярожныя звяры насамрэч выйдуць да людзей, аднак хваляванне кіпіць у крыві нават толькі ад магчымасці. Маці тым часам працягвае:

— Лічу важным, што Вольга расказала пра функцыю ваўкоў у лесе, іх павадкі і правілы паводзін пры нечаканай сустрэчы...

Разбітая лясная дарога выводзіць на велізарную паляну пасярод сырога лютаўскага лесу. Бліжэй да ўскрайку відненюцца бясформенныя ў густых прыцемках кармушкі для капытных і цёмныя слупы саланцоў. Размовы змаўкаюць. Паўсотні людзей — маленькіх і дарослых — заміраюць у чаканні галоўнага дзейства экафестывалю. Вольга сцісла распавядае пра камунікацыю драпежнікаў і падносіць да вуснаў вабу. У зыбкай цішыні, узвіваючыся ў халоднае мокрае неба, густымі пераліваміі разыходзіцца прызыўнае ваўчынае выццё...

— У студзені-лютым у драпежнікаў пачынаецца шлюбны сезон, таму яны часцей адклікаюцца, — тлумачыць гід, пакуль група аддыхваецца ад выплеску адрэналіну, што агнём расцякаецца па жылах. Ад спрадвечнай насцярожанасці, страху перад цемрай і тым, што хаваецца ў ёй, не пазбавіцца нават у натоўпе.

— Сёння, на жаль, занадта ветрана. Нас шэрыя пачуюць, а вось мы іх...

На «дэсерт» Вольга ўключае аўдыёзапіс, прафесійна «наспяваны» (чытай, навыты) егерамі з вабай. Сумнае шматгалоссе расплываецца па акрузе... Прагна ўслухоўваюся ў начны вецер. Пад самы канец чакання, на грані чутнасці прыходзіць водгук, пачуццё яднання з прыродай, сугучнасці ёй становіцца поўным. Хіба гэта не дакладны паказчык, што мерапрыемства атрымалася на ўсе сто?

**Александрына ПАРШЫНА,**
**фота аўтара.**

Надвор'е

# Дажджы, туманы, галалёдзіца

**Апошнія дні зімы заўсёды так — дзень становіцца даўжэйшы, а тэмпература вышэйшай. Гэты тыдзень таму — яркае пацвярджэнне, калі днём тэмпература паветра будзе дасягаць 16 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Вельмі цёплае надвор'е па тэмпературным рэжыме больш чым на месяц апярэджвае кліматычны графік. Сярэднясутачныя тэмпературы паветра ў асноўным на 6—11 градусаў вышэйшыя за сярэднія шматгадовыя значэнні. Цёплае акіянічнае паветра і ападкі ў выглядзе дажджу сталі прычынай хуткага разбурэння снежнага покрыва.

А ў аўторак умовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі па паўночным захадзе краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Воблачна з праясненнямі. Уначы пераважна па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць дажджы. Удзень без істотных ападкаў, толькі на паўночным захадзе месцамі невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман, па паўночным усходзе на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса па ўсходзе да плюс 7 градусаў па захадзе, днём будзе 5—11 цяпла, у заходніх і паўднёвых раёнах краіны ад 12 да 16 градусаў вышэй за нуль.

Адносна ціха будзе і ў сераду. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны ўмовы надвор'я абумовіць вобласць павышанага атмасфернага ціску, толькі па паўночным захадзе захаваецца ўплыў франтальнага раздзелу. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўночным захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 2 марозу па паўднёвым усходзе краіны, да плюс 8 градусаў па захадзе. Максімальная тэмпература днём складзе ад 5 градусаў па ўсходзе да 16 цяпла ў паўднёва-заходніх раёнах краіны.

У апошні дзень зімы надвор'е крыху сапсуецца. У чацвер ноччу ўмовы надвор'я будзе вызначаць франтальны раздзел, які ссоўваецца ва ўсходнім напрамку, а днём наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам няўстойлівай паветранай масы. Воблачна з праясненнямі. Ноччу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём месцамі па краіне чакаюцца невялікія дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 градус да 5 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны да плюс 7 градусаў, максімальная днём — 4—10 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 13 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, з пятніцы да нядзелі (1—3 сакавіка) будзе пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі слабыя туман і галалёд. Уначы сіноптыкі абяцаюць ад мінус 3 градусаў па ўсходзе да плюс 6 градусаў па захадзе, днём — ад плюс 5 градусаў ва ўсходніх да плюс 15 градусаў у паўднёва-заходніх раёнах краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# СВЯТЛО РОЗНЫХ СЛОЎ...

**У Беларусі, дзе прасторна прадстаўнікам розных канфесій і дзецям розных народаў, можна і турызм адмысловы ладзіць, з улікам знаёмства з асаблівасцямі розных рэгіёнаў сапраўды шматнацыянальнай краіны. Можна па гарадах і мястэчках вывучаць, напрыклад, і вытокі яўрэйскай літаратуры, і культуры яўрэйскага народа. Шмат хто з ураджэнцаў старажытных паселішчаў зрабіў свой важкі ўнёсак у яўрэйскае прыгожае пісьменства.**



Узда (1918 год).

Давайце зазірнём хоць бы на Міншчыну, у некаторыя яе паселішчы... Узда, Шацк, Дукора, Смілавічы, Ігумен — сённяшні Чэрвень, Беразіно...

Спярша пабываем на Уздзеншчыне. У сённяшнім райцэнтры ў 1887 годзе нарадзілася пісьменніца Двора Барон. Першыя асветніцкія ўрокі атрымала ў роднай сям'і. Вядома, што на Міншчыне яна закончыла гімназію. А ў 1911 годзе выехала з Беларусі. Выйшла замуж за рэдактара адной з яўрэйскіх газет. Жыла ў старонцы, якая яшчэ толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў стане дзяржавай Ізраіль. У 1910-я гады пачалося фарміраванне нашай зямлячкі як пісьменніцы. Першыя апавяданні — пра жыццё ў звычайным мястэчку ў Беларусі, Расійскай імперыі. Першы зборнік — «Апавяданні» (1927). Затым пабачылі свет кнігі «Пакуль што» (1943) і «Справы» (1951). Двора пераклала на іўрыт раман Г. Флабера «Мадам Бавары».

З Уздзеншчыны, магчыма, завітаўшы ў Магільнае (альбо — Наднёман), на радзіму вельмі папулярнага напрыканцы XIX стагоддзя яўрэйскага празаіка Якнегоза, скіруем свой шлях на Шацк, мінём Рудзенск.

І зробім прыпынак у Дукоры. 1880-я гады падаравалі свету сям'ю літаратараў Чарны. Вядомыя пісьменнікі. Ды, праўда, трэба ўдакладніць, што ведамасць іх распаўсюджваецца на Амерыку, тыя краіны, дзе зараз ведаюць літаратуру на ідзіш. Старэйшы з усіх — Шмуэль Нігер (Чарны). Нарадзіўся ў 1883 годзе. У Мінск з мястэчка перабраўся ў 1896 годзе. Першыя артыкулы друкаваў у газеце на іўрыце. Пасля рэвалюцыі 1905 года перайшоў на ідзіш. У 1908 годзе заснаваў у Вільні часопіс. Лепшыя нарысы, творчыя партрэты пісьменнікаў увайшлі ў яго кнігі — «Гутаркі пра яўрэйскіх пісьменнікаў» (1913), «Гутаркі пра кнігі» (1922). З 1919 года — у ЗША. У Амерыцы наш зямляк напісаў і выдаў манаграфіі пра Шалома-Алейхема, Мендэле Мойхера-Сфорыма, І. Л. Пераца, Г. Левіка. Памёр у Нью-Ёрку ў 1955 годзе. Другі брат у сям'і пісьменнікаў — Борух Чарны (вядомы і пад псеўданімам Уладак Чарны, Б. Уладак). Нарадзіўся ў Дукоры ў 1886 годзе. Займаўся паэзіяй, прозай, крытыкай. У маі 1907 года ўдзельнічаў у Лонданскім з'ездзе сацыял-дэмакратаў. У амерыканскіх перыядычных выданнях у 1908 годзе надрукаваў серыю нарысаў «Дзеці народа». У гэтым жа годзе да чытача прыйшла яго драма «Моша Рабейні».



Дукора. Пухавіцкі р-н. Маёнтак (з малюнка Н. Орды).

...Незадоўга да смерці вядомага ў Беларусі Рыгора Рэлеса мне давялося сустракацца з гэтым літаратарам, ураджэнцам Бешанковіч, і пашчасціла падрыхтаваць вялікае інтэрв'ю са старэйшынам яўрэйскіх пісьменнікаў у Беларусі. Сярод іншых нашых землякоў Рыгор Рэлес згадваў і дукорскіх братоў Чарны. Асобная старонка ў біяграфіі Боруха — знаёмства з паэтам Г. Левікам. Але да яго асобы мы звернемся, завітаўшы ў Чэрвень... Самы малодшы з братоў Чарны — Даніэль — нарадзіўся ў Дукоры ў 1888 годзе. Хворы ад нараджэння, ён шмат часу праводзіў у бальніцах, клініках Расіі, Швейцарыі, Германіі, іншых краін. Уласныя фізічныя пакуты знайшлі месца і ў творчасці. За 50 гадоў літаратурнай работы Даніэль Чарны напісаў нямала і дзіцячых кніг. А галоўны твор нашага земляка — раман «Сямейная хроніка». Можна толькі здагадвацца, колькі там «дукорскага» матэрыялу! Ужо ў сталым узросце Чарны ўзяўся за работу, якую збіраўся ажыццявіць з самых малых гадоў, — гісторыка-краязнаўчы нарыс «Дукор» (менавіта так і ў перакладзе гучыць — Дукор). Кніга пра роднае мястэчка пабачыла свет у Канадзе ў 1951 годзе. Памёр Даніэль Чарны ў Бостане. Кнігі таленавітага літаратара па-ранейшаму выдаюцца і зараз у ЗША і Ізраілі. З маладзейшага пакалення яўрэйскіх пісьменнікаў Беларусі — і ўраджэнец Дукоры Ліпа Гелер (нарадзіўся ў 1915 годзе). Яго зборнік вершаў на ідзіш — «Нараджэнне» — пабачыў свет у Мінску ў 1934 годзе. У 1941—1945 гадах Ліпа Гелер — на фронце. Пасля Вялікай Айчыннай вайны настаўнічаў, жыў у Смаленску. Да літаратурнай творчасці вярнуўся ў 1970-я... Пачаў ізноў друкавацца. Апошнія свае гады (памёр у 1989 годзе) правёў у Мінску. Пэўна, завітваў і ў Дукору, роднае мястэчка. І для таго ж, каб ушанаваць памяць пра загінулых родных: у лістападзе 1941 года фашысцкія карнікі расстралялі ў Дукоры 275 яўрэяў.



Ігумен (Чэрвень). Прачкі (пач. XX стагоддзя).



Смілавічы (1918 год).

З Дукоры — лічаныя кіламетры да Смілавіч. Адтуль па дарозе на Магілёў едзем у Чэрвень — старажытны Ігумен. У павятовым горадзе 25 снежня 1888 года нарадзіўся Левік Гальперын. Бацька яго працаваў настаўнікам. За ўдзел у рабочым руху маладога паэта выслалі ў Сібір. З высылкі Левік уцёк у 1913 годзе. Месцам жыхарства абраў ЗША. І там яны сустрэліся з адным з братоў Чарны. Болей дасведчаны і спрактыкаваны літаратар Борух Чарны дапамог земляку пазнаёміцца з рознымі выдавецтвамі, рэдакцыямі часопісаў і газет. Аказаў садзейнічанне ў выданні першага вершаванага зборніка. У 1930—1940-я гг. Левік прыняў актыўны ўдзел у антыфашысцкім руху. Катастрофе яўрэяў у Еўропе прысвяціў шэраг вершаў і паэм. У 1936 годзе наведаў СССР. І, адчуваючы з Еўропы моцны вецер фашызму, стаў у Амерыцы адным з арганізатараў магутнай антыфашысцкай кампаніі. Памёр ураджэнец Чэрвеня—Ігумена ў 1962 годзе.

Мы не зазірнулі ў Смаргонь, Баранавічы і Шклоў, Віцебск і Чашнікі... Гэта ўжо — за межамі Міншчыны. І тыя гарады, мястэчкі вылучылі таксама вялікую кагорту яўрэйскіх пісьменнікаў Беларусі. Шмат хто з іх разгарнуў свой талент у 1920—1930-я гг., калі ўсталёўвалася Савецкая ўлада. Дарэчы, у дадзены час у Саюзе пісьменнікаў БССР нават існавала асобная яўрэйская секцыя. Літаратура, створаная ўраджэнцамі і Уздзеншчыны, і Пухавіччыны, і Чэрвеньшчыны, — яркая крыніца сацыяльнага, грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі. І яшчэ, відавочна, прыйдзе час, калі на гэтую акалічнасць звернуць увагу не толькі літаратуразнаўцы, але і гісторыкі.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

**Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**



Смілавічы. Манастыр (з малюнка Н. Орды).

# ПАМЯТАЦЬ УСІХ ПАЙМЕННА









У Любанскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя Івана Муравейкі адбыўся вечар памяці Міхаіла Барашкава, які ўзначальваў рэдакцыю газеты «Звязда» ў найбольш складаны для нашай краіны час — у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод любанскіх балот на легендарным партызанскім востраве Зыслаў у студзені 1943 года быў аднойлены выпуск не толькі газеты «Звязда», але і рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена», любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». Рэдактарам усіх гэтых выданняў быў Міхаіл Барашкаў.

Жыццё гэтага смелага і таленавітага чалавека абарвалася ў лютым 1944 года.

Сцэнарый вечара памяці «З намі век будзе жыць...» напісаў настаўнік гісторыі, краязнавец, наш сталы чытач і аўтар Анатоль Вялічка *(на здымку падчас выступлення)*.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

Лёсы

# «МІЛАЯ МАЯ МАРЫЛЬКА!»

**Выстава з такой назвай адкрылася ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Гэтыя словы ўзяты з ліста Адама Багдановіча, які ён адправіў сваёй жонцы.**

Новая экспазіцыя прысвечана 155-годдзю маці паэта Марыі Апанасаўне. На жаль, дакладная дата яе нараджэння не вядомая, дарэчы, як і многія іншыя дэталі яе біяграфіі. Нават наконт таго, як і дзе пазнаёміліся будучыя бацькі Максіма Багдановіча, выказваюцца розныя версіі. Але мастацка-дакументальная выстаўка, якая з'явілася дзякуючы супрацы Літаратурнага музея Максіма Багдановіча з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, дазваляе даведацца пра новыя факты, звязаныя з сям'ёй класіка беларускай літаратуры і той эпохай, калі ён нарадзіўся.

Звычайна падчас экскурсій у музеі больш увагі ўдзяляецца Адаму Рыгоравічу, яго ролі ў выхаванні Максіма. Бацька навучыў яго любіць кніжны свет, разумець літаратуру, прывіў цікавасць да ведаў. Але нельга выключаць, што і маці паспела аказаць уплыў на свайго сына, нездарма ж кажуць, што многае закладваецца ў асобу ўжо ў першыя гады жыцця.

— Мы не ведаем, якія калыханкі яна спявала, якія словы казала. Але з яе лістоў можна пабачыць, што яна вельмі хвалявалася за сваіх дзяцей, калі яны раптам знікалі з яе поля зроку. Калі дзецьмі апекаваўся бацька, ён быў вымушаны падрабязна апісваць, як яны харчуюцца, чым займаюцца, ледзьве не па гадзінах распісваць усё, што адбывалася. Няма асаблівa згадак пра маці і ў Максіма Багдановіча. Пра тое, што было схавана ў яго душы, мы можам рэканструяваць толькі дзякуючы вершам і аддаленым згадкам людзей, якія яго атачалі. У зборніку «Вянок» раздзел называецца «Мадонны», дзе стрыжнёвым вобразам паказваецца жанчына-маці, — заўважае **дырэктар музея Міхаіл БАРАНОЎСКІ** і спадзяецца, што выстава дазволіць больш уважліва аднесціся да жанчыны, якая дала жыццё адначу з геніяў беларускай літаратуры. Тым больш што асоба гэта сапраўды вельмі цікавая, жывая, эмацыянальная, непасрэдная, разам з тым таленавітая. Жанчына мела многа творчых задаткаў, якія не паспелі рэалізавацца. З-за цяжкай хваробы Марыі не стала ў 27 гадоў.

Вялікая частка архіваў сям'і Багдановічаў трапіла ў розныя ўстановы як у Беларусі, так і за яе межамі. Вялікі комплекс дакументаў захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Працуючы з ім, можна адкрываць новыя факты, паглыбляцца ў мінулае, даведвацца





пра ўзаемаадносіны паміж роднымі Максіма і людзьмі з іх акружэння, знаходзіць розныя падыходы да разумення творчасці паэта. Копіі некаторых з гэтых дакументаў прадстаўлены на выстаўцы «Мілая мая Марылька!» Аднымі з найбольш цікавых з іх з'яўляюцца лісты, якія Марыя і Адам Багдановіч слалі адно аднаму. Цёплыя, шчырыя словы ў іх сведчаць пра моцнае каханне паміж сужэнцамі, клопат, павагу. Таксама ў перапісцы падаецца і звычайнае побытавае жыццё. Марыя дакладае мужу пра тое, на што пайшлі грошы, расказвае пра капрызы сыноў, дзякуе за падарункі. Падаецца і перапіска Марылі з іншымі асобамі, напрыклад з сястрой Адама Багдановіча. Пісьмовыя дакументы дапаўняюць фатаграфіі, каб паказаць людзей, з якімі сустракаліся, сябравалі бацькі Максіма Багдановіча. Дзякуючы вывучэнню дакументаў, пры падрыхтоўцы да выстаўкі атрымалася зрабіць некалькі новых адкрыццяў. Напрыклад, даследчыкі змаглі ідэнтыфікаваць адну з фатаграфій з сямейнага альбома, надпіс на адваротным баку якой раней падаваўся нечытэльным. Музейшчыкі ўстанавілі, што на фота — хросны бацька Максіма.

Дакументы сведчаць і пра тыя складанасці, якія выпалі на лёс Марыі Апанасаўны. Калі яе бацька памёр, а маці трапіла ў багадзельню, тады яшчэ зусім юная Марыя апынулася ў прытулку. Дзяўчынцы дапамагла жонка губернатара, якая забрала яе ў свой дом, накіравала вучыцца ў Мінскае жаночае вучылішча. Ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што Марыя вучылася і ў Пецярбургу ў земскай настаўніцкай школе... Адзін з лістоў захаваў і сведчанне пра тое, як цяжка было маладой жанчыне, калі яна захварэла на сухоты.

Расчытаць, што напісана ў лістах і цыдулках вельмі дробным почыркам, не так проста. Таму ўрыўкі з іх былі агучаны артыстамі народнага студэнцкага тэатра «Жывое слова» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Пачуць гэтыя запісы можна дзякуючы QR-кодам побач з дакументамі.

На адкрыццё выставы прыехала ўнучатая пляменніца Максіма Багдановіча Вольга Дашкоўская. Яна нагадала пра ўспаміны Адама Багдановіча, калі той перажываў, як цяжка Максім мог успрыняць хваробу і смерць маці. Яго, гарэзлівага хлопчыка, бацька пакінуў на крэсле побач з хворай жонкай. Малы прасядзеў так некалькі гадзін...

Таксама відэазварот даслала з Краснадара Наталля Сарока. Яе прабабуля была сястрой Марыі Апанасаўны. Наталля Сарока падзякавала супрацоўнікам музея за пошукавую дзейнасць, якая дазваляе адкрываць новыя старонкі ў жыцці Максіма і яго родных.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,
фота аўтара.**





Майстар-клас

# ВОДАР ЛЮБОВІ ДА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

## Да музейнага пакоя ў Грабаўскай сярэдняй школе Гомельскага раёна вядзе... пах

**Тонкі пах становіцца насычаным, калі разам з настаўнікам біялогіі Аленай БАРАВІКОВАЙ адчыняем дзверы і трапляем у сапраўднае царства водараў. 33 шкляныя ёмістасці напоўнены травамі, вырашчанымі ці сабранымі на тэрыторыі вакол гэтай школы. А яшчэ тут складаныя букеты, кампазіцыі, сашэ, разнастайныя падарункавыя скрыначкі з пахкім змесцівам. Незвычайныя экспанаты, запэўнівае педагог, выкарыстоўваюцца на занятках, а не толькі цешаць вока і органы нюху.**

### КАЛЕКЦЫЯ, ЯКАЯ ПРАЦУЕ

— Менавіта тут у сёмым класе мы вывучаем тыпы, класы і сямейства. Напрыклад, паказваю родная прыкметы сямейства раслін. Бываем тут на геаграфіі і краіназнаўстве, калі вывучаем флору. Глядзім прыродныя зоны — дзе што вырошчваюць. Дзеці, калі трымаюць на далоньцы пахкія пацеркі, хутка запамінаюць, што, напрыклад, В'етнам займае першае месца ў свеце па экспарце чорнага перцу. Калекцыя змяняецца з году ў год — травы ўвесь час абнаўляюцца.

Алена Васільеўна распавядае, што ідэя стварыць незвычайны музей водараў узнікла ў 2010 годзе. Менавіта тады школьнікі, знаходзячыся ў летнім лагеры, збіралі расліны для гербарыя. Хтосьці прынёс велізарны букет мяты і паклаў яго на парту.

— І тады адна з маіх вучаніц сказала: «Як добра было б захаваць водар лета». З гэтага ўсё і пачалося. Цяпер у нашай калекцыі самыя розныя віды раслін. Частка — культурных, частка — дзікарослых. Мы сталі апытваць мясцовых жыхароў, якія расліны яны ўжываюць у ежу. Пятрушку і кроп ведалі ўсе. А вось пра тое, што ў гародзе можна вырошчваць мацярдушку і базілік, раней ведалі нямногія. Мы навучыліся вырошчваць гэтыя і іншыя цікавыя расліны — такая градка прыгожая атрымалася! На ёй, напрыклад, манарда, некалькі відаў мяты, мацярдушка, лаванда, палын, аксаміткі... Ведаеце, што аксаміткі ў Грузіі называюць «імерацінскі шафран» і дадаюць у спецыі?

### ХРЫЗАНТЭМА ДЛЯ САЛАТЫ

А яшчэ, высвятляецца, хрызантэма — гэта не толькі выдатныя восеньскія кветкі, але і... гародніна. Некаторыя сарты з мноствам лісця рэкамендуюцца для ўжывання ў ежу. У Грабаўцы не тэарэтызуюць доўга. Проста садзяць на градку і потым прапануюць наразаць мясістае вельмі карыснае лісце ў салату.

— Лісце і кветкі хрызантэм мы збіраем. Пасля зрэзкі кусцікі хутка зноў абрастаюць. Смак у іх нейтральны. Зеляніна ўтрымлівае шмат калію. Дарэчы, кветачкамі хрызантэмы ўпрыгожваюць нават вясельныя тарты. У Кітаі і Японіі іх ядуць. Калі захочаце пасадзіць хрызантэму агароднінную, — Алена Васільеўна адразу пераходзіць да рэкамендацый, — майце на ўвазе, што ўсходжасць насення і выжывальнасць раслін вельмі добрая. Такім чынам можна атрымліваць зеляніну хрызантэмы круглы год.

Захавальнік водараў распавядае, што школьны музей ведаюць усе жыхары Грабаўкі. Адны зазываюць у госці, каб падарыць галінку тыбецкага шалфею ці цытрынавага палыну. Усе разам збіраюць у гістарычным Грабаўскім парку дзікарослую цыбулю.

— У гэтай расліне велізарная канцэнтрацыя вітаміну С і карысных мікраэлементаў, — растлумачвае Алена Баравікова. — Цыбуля падыходзіць для вясновай салаты. А яшчэ ў нашай школе кожны месяц асаблівы. Прайшлі «палынавы верасень», «кастрычнік, які пахне хрызантэмай», «лістапад са смакам і водарам айвы», «снежаньскія вітаміны шыпшыны»...

### ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕЧАРЫНЫ І БІЗНЕС

Такая магія водараў знаходзіць працяг пры арганізацыі ўтульных школьных мерапрыемстваў. Тэматычны вечар можа быць прысвечаны, напрыклад, адной пэўнай расліне. Усім удзельнікам трэба знайсці стыльныя ўборы ў вызначаным колеры, зрабіць адпаведны макіяж, падрыхтаваць цікавую інфармацыю і мастацкія творы, вывучыць вершы...



Настаўнік біялогіі Алена БАРАВІКОВА з вучнямі.

— Напрыклад, на мятную вечарынку мы п'ём чай з гэтай выдатнай раслінай, з заплюшчанымі вачыма імкнёмся апазнаць розныя пахі, — выкладае свае ідэі Алена Васільеўна. — У нас плануецца правесці кававы фестываль. Можна будзе пакаштаваць каву з кардамонам, з бадзяном, з карыцай... Духмяныя сезоны прысвецім Кацярыне Вялікай, якая вельмі любіла каву і калісьці даўно праязджала праз наш населены пункт. Зробім кававую вечарынку ў стылі XVIII стагоддзя. Ёсць думка правесці ў нашай цудоўнай Грабаўцы кантры-фестываль.

Яшчэ адзін кірунак работы музея водараў — стварэнне духмяных сувеніраў. За гэта адказвае **намеснік дырэктара і кіраўнік бізнес-кампаніі «Юны прадпрымальнік» Наталля ПАНЬКОВА:**

— Сёння мы вырабляем духмяныя паштоўкі, чаі, водарныя боксы, сашэ для араматызацыі адзення і памяшканняў — альтэрнатыву штучным араматызатарам. Прадукцыі вырабляем шмат. Усё вырашчана сваімі рукамі без хімікатаў. Музей жыве і развіваецца, а ў нас нараджаюцца новыя ідэі. Адны школьнікі ствараюць гэту прыгажосць, іншыя афармляюць, трэція прадаюць. Пакуем прыгожа, каб людзям спадабалася. Мы ўзаемадзейнічаем з Гомельскім медыцынскім каледжам. Многія дзеці, якія ўдзельнічаюць у нашай бізнес-кампаніі, будуць ведаць, як ствараць свой бізнес. У будучыні ім гэты досвед спатрэбіцца.

### ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ СПАКВАЛЯ

У актыў музея ўваходзяць старшакласнікі. Арцём Ганчарэнка — алімпіяднік і актывіст, цяпер вучыцца ў 10 класе. Юнак кажа, што бачыць сябе ў будучыні настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. У роднай школе, вядома.

— На конкурсе «100 ідэй для Беларусі» я прадстаўляў наш музей водараў і нашу гістарычную ліпавую алею. Хацеў бы вучыцца ў Гомельскім універсітэце імя Францыска Скарыны і потым вярнуцца сюды працаваць. Пакуль што хачу правесці даследаванне наконт назваў раслін на беларускай, рускай мовах і мясцовых дыялектах.

Сярод пахаў мясцовага лесу дзеці знаходзяць сабе справы па душы. Менавіта тут школьнікі разумеюць, што ім больш падабаецца: батаніка, краязнаўства, фармацэўтыка, медыцына ці, напрыклад, як дзевяцікласніцы Багдане Нікіцінай, ландшафтны дызайн:

— Хачу стаць дызайнерам інтэр'ера і ландшафту. Я дапамагаю Алене Васільеўне ствараць сувеніры. Прыгажосць і эстэтыка важныя ў жыцці, і мне вельмі падабаецца ўсё прыводзіць у гармонію.

Каця Іванчанка, як і Настасся Цыганова, займаецца пакаваннем духмяных сувеніраў. Каця ў школьнай бізнес-кампаніі — яшчэ і памочнік кіраўніка:

— У нашым музеі кожны вучань можа знайсці тое, што менавіта яму больш падабаецца. Я дапамагаю пакаваць сувеніры, а для гэтага папярэдне трэба падабраць паперу, выразаць, прыдумаць дызайн.

Наталля Мельнікава збіраецца паступаць у каледж на майстра лесу. Дзявяцікласніца ўпэўнена, што досвед удзелу ў школьнай бізнес-кампаніі абавязкова будзе запатрабаваны:

— Я на градках вырошчвала і потым збірала розныя расліны. Ведаю, што кожнай патрэбна свая глеба, умовы, падыход.

### ДУБ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЖОЛУДА

Дарэчы, рыхтаваць леснікоў тут павольна пачынаюць з дзіцячага садка, адзначае **выхавальнік**



Выхавальніца Наталля ШАРКО з дзецьмі.

**Святлана ШУЛЬГА** і бярэ ў рукі вялікую рэптылію:

— Глядзіце, гэта чарапаха вельмі вялікая, але яна не кусаецца, а вось гэтыя меншыя, у акварыуме — больш небяспечныя, яны любяць паесці на сняданак мяса. Таму іх мы ў рукі браць не будзем.

Малым вывучаць паводзіны чарапашак не менш цікава, чым вырошчваць сапраўдны дуб. Гэтай сур'ёзнай справай з дзецьмі займаецца **выхавальнік Наталля ШАРКО**. Педагог падрабязна растлумачвае, што трэба рабіць, каб маленькі жолуд ператварыўся ў велізарнае магутнае дрэва:

— У нас з дзецьмі ідзе сапраўдная даследчая работа. Тут, у Грабаўцы, ёсць дубы, з якіх дзеці збіраюць якасны пасадачны матэрыял. Жалуды прарошчваюць і назіраюць, як развіваюцца расліны.

У педагогаў ёсць мэта — высадзіць вырашчаныя дубы ў лясным масіве недалёка ад школы. Дарэчы, установа адукацыі знаходзіцца ў гістарычным месцы. Праз населены пункт некалі праходзіў шлях імператрыцы Кацярыны II з Пецярбурга ў Кіеў. Магутныя ліпы і дагэтуль вызначаюць «Кацярынінскі шлях».

— Дубовы парк — дуброву плануем дзесьці паблізу размясціць, — адзначае **дырэктар Грабаўскай сярэдняй школы Гомельскага раёна Таццяна МАЦЮШЭНКА**. — Школьнае лясніцтва для старшакласнікаў у нас існуе вельмі даўно. Але сёння мы аб'яднаны ў комплекс з дзіцячым садком. Хочам, каб дзеці з маленства спасцігалі асновы прыродазнаўства. Ну, а форму для малых падарыў Гомельскі лясгас. Гэта абсалютная копія формы дарослых: з таго ж матэрыялу, з тымі ж нашыўкамі. Мы жывём сярод лесу і, вядома, вельмі сябруем з тымі, хто гэты лес ахоўвае. Леснікі прыходзяць да нас, а мы наведваем іх.

### ЛЕСНІКІ І МЕДЫКІ

Сёння ва ўстанове адукацыі працуюць над стварэннем экалагічнай сцяжынкі. Плануюць не занадта працяглы, але вельмі цікавы маршрут. Ён будзе пачынацца ад установы адукацыі і пройдзе ў межах населенага пункта, дзе ёсць усе асноўныя прыродныя зоны, пра якія цікава даведацца юным абаронцам прыродных багаццяў Беларусі. **Намеснік дырэктара Грабаўскай сярэдняй школы Наталля ПАНЬКОВА** кажа, што праект, распрацаваны педагогамі ўстановы адукацыі, прадугледжвае рознабаковае экалагічнае выхаванне дашкольнікаў на працягу ўсяго навучальнага года:

— У праграме — экалагічны дэсант, квэст, акцыі «Пасадзі дрэва» і «Чысты лес», фотавыставы і тэматычныя гутаркі, экапаляванне і вывучэнне экалагічнага становішча. Наш праект «Дашкольнае лясніцтва» спрыяе стварэнню выхаваўча-адукацыйнага асяроддзя, у якім дашкольнікі падчас практычнай дзейнасці набудуць навыкі лесаводчай, прыродаахоўнай дзейнасці.

Сёння многія дарослыя выпускнікі Грабаўскай школы ганарацца «сваім» навакольным лесам. Яны былі членамі мясцовага лясніцтва, як і сённяшнія вучні школы, а значыць, удзельнічалі ў працоўных акцыях, у навядзенні парадку ў лясных масівах, у назіраннях за прыродай і, вядома, у пасадках дрэў. Многія вызначыліся з прафесіяй менавіта дзякуючы ўдзелу ў рабоце школьнага лясніцтва і сёння ўжо працуюць па розных спецыяльнасцях лясной гаспадаркі.

— А яшчэ сярод маіх былых вучняў вельмі шмат медыкаў, — адзначае кіраўнік «Музея водараў» Алена Баравікова. — Ёсць і хірургі, і тэрапеўты, і фітатэрапеўты, і медсёстры розных профіляў. Я з усімі на сувязі, яны заходзяць у госці, прывозяць пахкія сувеніры. Нават тыя, чыя прафесія ніяк не звязана з біялогіяй, аб'яднаны духмяным захапленнем.

### ПРЫРАСЦІ ДА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

**Начальнік аддзела адукацыі Гомельскага райвыканкама Кацярына ПЛЯГА** упэўнена, што экалогія — гэта частка патрыятычнага выхавання школьнікаў:

— Вучні Грабаўскай сярэдняй школы набываюць не толькі добрыя веды, але і ўменні працаваць рукамі. Атрыманыя навыкі дазволяць ім у будучыні някепска існаваць на сваёй зямлі. Яны на сваім досведзе ведаюць, як пасадзіць расліны, як іх сабраць і перапрацаваць, як прадаць. Адначасова прыходзіць такая неабходная ўсім нам любоў да роднай зямлі. Па сутнасці, яны самі каранямі прырастаюць да гэтай унікальнай вёскі, да свайго раёна. Такім чынам адначасова ідзе экалагічная, этнаграфічная і патрыятычная работа. Дзеці, узрастаючы, якарацца на гэтай зямлі. Цяжка кінуць і з'ехаць ад таго, да чаго ты моцна прывязаны. Таму мясцовыя, нават калі з'язджаюць адсюль, не забываюць сваю малую радзіму і абавязкова вяртаюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638

**Продавец:** ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, УНП 101063229. Тел.: + 375 29 688-04-88

| Лот, № | Предмет аукциона | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированные помещения:** **№ 1** (производственное помещение, 600/D-91728) 206,3 кв. м, **№ 2** (административное помещение, 600/D-91729) 221,7 кв. м, **№ 3** (производственное помещение, 600/D-91730) 288,4 кв. м, **складское помещение** (600/D-40243) 205,2 кв. м | **1 486 800,00** | 74 340,00 |
| 2 | **Административное помещение** (этаж 3, 600/D-40239) 233,6 кв. м | **480 000,00** | 24 000,00 |
| 3 | **Административное помещение** (этаж 5, 600/D-40241) 83,9 кв. м | **165 600,00** | 8 280,00 |
| Местоположение лотов №№ 1–3 – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников, 3** Обременение: площади помещений (лоты № 1-3) частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте ipmtorgi.by) | | | |
| 4 | **Административно-торговое помещение** (500/D-7023833) 733,5 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6 | **2 241 600,00** | 112 080,00 |
| 5 | **Кабинеты 87,9 кв. м с открытой автостоянкой пл. 523 кв. м** (500/D-708041778), по адресу: г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а | **356 400,00** | 17 820,00 |
| 6 | **Стулья, кресла в составе 33 единиц.** Перечень см. на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by | **3 097,20** | 154,86 |
| 7 | **Офисная мебель и оргтехника в составе 404 единиц.** Перечень см. на сайте ipmtorgi.by | **184 483,20** | 9 224,16 |

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток – 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение от 2 до 10 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете "Звязда" от 06.02.2024 г.

**Дата и время начала аукциона: 12.03.2024 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5

**Прием заявок: по 11.03.2024 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 5

**Контакты: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06, auction@ipmconsult.by**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ПКУП «Жилкомплект», г. Минск, ул. Аннаева, 67 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

